Браслаўшчына здаўна заваявала славу аднаго з найпрыгажэйшых прыродных куткоў Беларусі і хутка тут збіраюцца адрадзіць элітны від спорту — рэгату.

СТАР. 5

У Старадарожскім раёне ў вёсцы Залужжа жывуць самабытныя людзі — сакуны ці, дакладней, іх нашчадкі. Сакунамі карэнных насельнікаў назвалі таму, што яны своеасабліва вымаўляюць дзеясловы, якія заканчваюцца на «ся». «Ой, нагукалаСА, стамілаСА, ды павалілаСА».

СТАР. 5

Белвідэацэнтр зрабіў фільм пра оперу «Фаўст», напісаную Антоніем Генрыкам Радзівілам. Лібрэта для гэтай оперы напісаў сам Гётэ па просьбе нашага славутага земляка.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. СУБОТА № 120 (27235) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НА РОЛІКАХ — ПРАЗ ЛЕТА

г. Віцебск

Дарагія юнакі і дзяўчаты!

Сардэчна віншую вас з Днём моладзі.

Маладосць — час смелых імкненняў і цудоўных адкрыццяў. Гэта час, калі фарміруюцца маральныя прынцыпы і грамадзянская пазіцыя, закладваюцца асновы светапогляду.

Менавіта вам, новаму пакаленню беларусаў, заўтра трэба будзе вызначаць далейшую будучыню нашай дзяржавы, быць у адказе за тое, якім стане родны край у бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Сёння ў краіне створаны ўсе ўмовы для таго, каб кожны мог спаўна рэалізаваць сябе ў грамадска-палітычным, навуковым, культурным і духоўным жыцці краіны.

На сучасным этапе грамадства чакае ад моладзі нестандартных, канструктыўных рашэнняў, якія дазволяць прымножыць усё тое станоўчае, што створана папярэднімі пакаленнямі.

Наперадзе ў вас шырокая дарога жыцця. Не бойцеся цяжкасцяў, ідзіце наперад. Упэўнены, што вы зробіце ўсё неабходнае для забеспячэння стабільнасці і росквіту Айчыны.

Ад усёй душы зычу вам здароўя, радасці, кахання, новых перамог і здзяйсненняў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Беларусь адбылася як незалежная дзяржава»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, які размешчаны ў будынку, непасрэдна прылеглым да Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з экспазіцыяй музея і сустрэўся з маладымі грамадазнаўцамі.

Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці створаны як філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі. Ён прызначаны стаць адным з самых важных цэнтраў па зборы, вывучэнні, захаванні і прэзентацыі матэрыялаў па сучаснай гісторыі Беларусі. Галоўны лейтматыў музейнай экспазіцыі — дасягненні краіны за гады дзяржаўнай незалежнасці, міжнароднае прызнанне нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа і суверэнітэту беларускай дзяржавы.

Аналагаў такіх музеяў ва ўсходнееўрапейскіх краінах не існуе.

«Атрымаўшы ў пачатку 1990-х гадоў шанц, мы выкарысталі яго спаўна. Усяго за два дзесяцігоддзі — нязначнае па мерках гісторыі імгненне, адчуваючы часам неверагодны націск звонку, мы стварылі, па сутнасці, новую еўрапейскую краіну», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Наша маладая дзяржава паказала, што нават невялікая краіна можа прымусіць сябе паважаць і праводзіць незалежны знешнепалітычны курс», — сказаў Прэзідэнт.

«Вы бачыце, якое цяпер стаўленне да нас з боку Захаду, ды і на Усходзе не заўсёды нас разумеюць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, «прычына не ў тым, што ў нас не той рэжым, не той прэзідэнт або яшчэ штосьці не тое». «Я не хачу праводзіць паралелі, але з некаторымі рэжымамі яны паспяхова супрацоўнічаюць, таму што там нафта, грошы і гэтак далей. Падумаеш, нейкая невялікая краіна ў цэнтры Еўропы вырашыла стаць незалежнай. Ад каго? Ад Расіі, Польшчы або Літвы, у складзе якіх мы заўсёды былі?» — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што незалежная Беларусь адбылася. «І з гэтым трэба згаджацца. Рана ці позна з гэтым давядзецца згадзіцца», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Наша мэта — стварыць дзяржаву, якой будуць ганарыцца не толькі нашы дзеці, але і мы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што беларусы ішлі да незалежнасці вельмі доўгім і цяжкім шляхам. «На працягу стагоддзяў нашы землі пераходзілі з адных дзяржаў у іншыя, а беларусы цярпелі і палітычны, і эканамічны, і культурны прыгнёт. Усё гэта было ў нашай гісторыі», — адзначыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

МЕДЫЦЫНА НАСУПЕРАК

Дэпутаты звярнуліся ў медустановы ў якасці заканадаўцаў

Пра існаванне такой медыцыны ў нашай краіне ведаюць не многія. Пра гэта мімаволі падумала на наступны дзень, калі прывяла свякроў на УГД ва ўчастковую паліклініку Мінска. Глядзела на шэрыя ад пылу гардзіны на канцылярскіх сашчэпках, на санітарку ў працёртым крэсле, цалкам пагружаную ў разгадванне крыжаванкі, слухала, як у калідоры нехта абмяркоўвае хранічны недахоп тэрапеўтаў («Пра што вы кажаце! 20 гадоў у нас няма ўчастковага ўрача...»), і ўзгадвала тое, што пабачыла напярэдадні разам з дэпутатамі.

Падчас адмысловага парламенцкага семінара па вывучэнні практыкі прымянення законаў у сферы аховы здароўя дэпутаты разам з журналістамі і кіраўнікамі медыцынскай галіны наведалі тры вядучыя клінікі краіны. Дзіўна, што і там, і тут — адна і тая ж сістэма, але дзіўна — толькі на першы погляд. Яшчэ мой універсітэцкі выкладчык гісторыі КПСС казаў, што Савецкі Саюз перамог у Вялікай Айчыннай вайне не дзякуючы, а насуперак абставінам. Вось і тут: дэпутаты на свае вочы пабачылі, што ў нас ёсць медыцына сусветнага ўзроўню. На наступны дзень я яшчэ раз ўпэўнілася, што не дзякуючы, а насуперак... Напэўна, такая наша ўласцівасць.

Ствалавыя клеткі і трансплантацыя

Памятаю сваю размову з галоўным урачом **9 гарадской клінічнай бальніцы Мінска** ў 90-я гады. Ён казаў, што ўтрыманне такіх клінік-манстраў, якія засталіся нам у спадчыну ад савецкіх часоў, эканамічна неапраўдана, імі складана кіраваць, іх надзвычай цяжка забяспечваць...

«Дзявятка» была адкрыта ў канцы 1976 года. Праз тры гады яна дасягнула сваёй поўнай магутнасці (1380 ложкаў) і практычна ва ўсе часы валодала самай буйной хірургічнай службай у горадзе. У 2012-м стала відавочна, што наша сістэма аховы здароўя бліскуча справілася з сітуацыяй. І справа не толькі ў тым, што сама клініка, з кафедрамі і навуковымі цэнтрамі, захавалася, — у 2009-м тут адбылася рэканструкцыя коштам $45 млн... Сёння тут робяць трансплантацыю органаў і тканак, высокатэхналагічныя аперацыі: для грамадзян Беларусі — бясплатна, а іншаземцы прывозяць у краіну дзясяткі і сотні тысяч долараў, каб даверыць свае жыцці нашым урачам...

Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова ўбачыць шчаслівыя вочы маладой жанчыны з Жодзіна з двухгадовым сынам на руках. Год таму хлопчыку была зроблена перасадка печані, донарам стала маці. Дыягназ — злаякасная, несумяшчальная з жыццём пухліна... Калі жанчына перад тэлекамерамі прамаўляе фразу: «Пасля аперацыі сын стаў размаўляць, пайшоў...» і раптам адварочваецца, утойваючы слёзы, то тэлеаператары спыняюць сваю работу, а журналісты больш не задаюць пытанняў.

...Дастаткова пачуць словы падзякі ў адрас беларускіх урачоў ад мужчыны, які прыехаў сюды з 24-гадовай дачкой з Украіны, каб аддаць ёй сваю нырку і тым самым выратаваць.

У сярэднім на працягу года клініка аказвае стацыянарную дапамогу прыкладна 39 тысячам пацыентаў, выконвае больш за 11 тысяч хірургічных аперацый, у тым ліку больш за 300 трансплантацый. У яе складзе 26 клінічных і 19 параклінічных аддзяленняў. На яе базе працуюць 5 кафедраў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і кафедра Медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а таксама 4 Рэспубліканскія цэнтры.

СТАР. 3

■ Прафсаюзная трыбуна

«ПАДУШКА БЯСПЕКІ» ДЛЯ ШКОЛ — УДЗЕЛЬНІЦ ЭКСПЕРЫМЕНТУ З ФІНАНСАВАННЕМ

З 1 студзеня 2013 года ў Беларусі плануецца запусціць эксперымент па ўкараненні новай сістэмы фінансавання ўстаноў адукацыі. Інфармацыя пра тое, што дзейная сістэма аплаты працы можа змяніцца, не на жарт усхвалявала школьных настаўнікаў. Нельга сказаць, каб педагогі былі задаволены цяперашнімі сваімі заробкамі, аднак чамусьці ўсе ўпэўнены, што змяненні на ўрад ці будуць у лепшы бок. Таму зусім невыпадкова пад першым пунктам на парадку дня пленума Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі значылася падрыхтоўка да правядзення эксперыменту.

— Сёння ў Расійскай Федэрацыі дзейнічаюць тры мадэлі галіновай сістэмы аплаты працы — «базавы аклад», «усё ўключана» і «вучнёўская гадзіна», — падзяліўся высновамі, зробленымі па выніках вывучэння досведу суседзяў, **старшыня ЦК галіновага прафсаюза Аляксандр БОЙКА**. — Нашы калегі з'яўляюцца прыхільнікамі першай мадэлі, якая рэалізуецца ў 47 суб'ектах Расійскай Федэрацыі. — Гэтая сістэма аплаты працы пабудавана такім чынам, што за 18 урокаў у тыдзень устанаўліваецца мінімальны базавы аклад, асаблівасці ж працы настаўнікаў улічваюцца з дапамогай павышальных каэфіцыентаў. Дадатковая работа, якая ўскладаецца на настаўнікаў з іх згоды (класнае кіраўніцтва, праверка пісьмовых работ, загадванне вучэбнымі кабінетамі, вучэбна-доследнымі ўчасткамі і г.д.) аплачваецца дадаткова, з прымяненнем розных механізмаў у межах сродкаў, што ёсць у адукацыйнай установы. Памеры даплат вызначаюцца ў рублях, працэнтах і праз каэфіцыенты.

«Вучнёўская гадзіна» выкарыстоўваецца ў якасці эксперыменту, пераўтвараючы школы ў адну вялікую бухгалтэрыю. Па завяршэнні эксперыменту адпаведныя рэгіёны плануюць ад яе адмовіцца. Адмовіліся яны і ад сістэмы «ўсе ўключана» — своеасаблівага рашэння штатна-акладнай сістэмы.

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ЖЫЛІН, старшыня канцэрна «Белнафтахім»:

Павышэнне цаны на дызельнае паліва ў Беларусі звязана з павышэннем яго якасці. Мы правялі больш глыбокую гідраачыстку дызелю. На гэты праект затрачана больш за $300 млн. Гэта акупны праект, які дасць народнагаспадарчы эфект у цэлым. Акрамя таго, для ахвотных застаецца магчымасць купляць дызельнае паліва больш нізкай якасці. Другая прычына высокай цаны на дызель — спекуляцыйны вываз без абмежаванняў паліва за мяжу.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 22°
Віцебск	+ 22°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 22°
Мінск	+ 20°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2012 г.

Долар ЗША	8330,00	▲
Еўра	10440,00	▼
Рас. руб.	248,50	▼
Укр. грыўня	1030,75	▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКІ ЧАСОПІС НАЗВАЎ МЕРКЕЛЬ НЕБЯСПЕЧНЫМ ЕЎРАПЕЙСКІМ ЛІДАРАМ

Брытанскі штотыднёвы часопіс New Statesman прызнаў канцлера Германіі Ангелу Меркель самым небяспечным еўрапейскім лідарам. На вокладцы канцлер паказана ў вобразе Тэрмінатара. Аўтар артыкула сцвярджае, што яна ўяўляе большую пагрозу сусветнай стабільнасці і росквіту, чым прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінеджад, прэм'ер-міністр Ізраіля Біньямін Нетаньяху і паўночнакарэйскі лідар Кім Чэн Ун. Паводле выдання, палітыка Меркель па выхадзе еўразоны з фінансавага крызісу, якая грунтуецца на мерах жорсткай эканоміі, можа прывесці ў канчатковым выніку да другой Вялікай дэпрэсіі. У сувязі з гэтым журналіст называе Меркель найбольш небяспечным нямецкім лідарам пасля Адольфа Гітлера. Аўтару здаецца дзіўным, што лідар краіны, дзе хваравіта ставяцца да любога згадвання аб нацысцкім мінулым, спакойна глядзіць на ўмацаванне неанацысцкіх партый па ўсёй Еўропе: ад Францыі да Грэцыі і Венгрыі.

АД ПОЛЬСКІХ ЖУРНАЛІСТАЎ ЗАПАТРАБАВАЛІ ПРАБАЧЭННЯЎ ЗА КПІНЫ З УКРАІНАК

Украінскі МЗС перадаў ноту пратэсту сваім калегам у Варшаве ў сувязі з непрыстойнымі жартамі польскіх журналістаў на адрас украінак. Ад журналістаў запатрабавалі публічна папрасіць прабачэння. Выказванні, якія паслужылі падставай для скаргі, вядучыя радыёстанцыі Eska ROCK дапусцілі падчас абмеркавання матча Еўра-2012 паміж зборнымі Украіны і Швецыі (ён завяршыўся перамогай украінцаў з лікам 2:1). У прыватнасці, дыджэй заявіў, што пасля матча «зрабіў, як сапраўдны паляк, — выгнаў сваю ўкраінку». У адказ Фігурскі сказаў, што «ён не заплаціць сваёй украінцы». Ва ўкраінскім МЗС падкрэслілі, што падобныя заявы «прыводзяць да распальвання нацыянальнай варожасці паміж палякамі і ўкраінцамі, а таксама знішчаюць сяброўства і добрую атмасферу ўкраінска-польскага стратэгічнага партнёрства».

НА ДАЧЫ ТРЭБА БЫЦЬ АСАБЛІВА АСЦЯРОЖНЫМ З АЛКАГОЛЕМ

Расійскія медыкі канстатуюць: летні сезон небяспечны для аматараў моцнага і слабага алкаголю. У спякоту есці, як правіла, не хочацца. Выпіўшы ўсяго адзін куфаль на галодны страўнік, можна моцна ап'янець. Што тычыцца піва, то перавышэнне нормы пагражае хваробамі падстраўнікавай залозы. А ў цёплы час года моцны алкаголь справакуе моцнае абязводжванне і спазмы сасудаў. Ад каньяку разаўецца ўзмоцненае потааддзяленне. Ідэальны варыянт — разведзенае віно. Асабліва алкаголю варта асцерагацца дачнікам. Нярэдка, знаходзячыся на прыродзе, чалавек пачынае піць з самай раніцы і заканчвае ўвечары.

У арганізме назапашваецца занадта шмат прадуктаў распаду спірту, а гэта пагражае арытміяй, рэзкім падскокваннем ціску і болем у печані. Таму лепш адкласці ўжыванне да вечара, калі спякота спадзе, не ўжываць салодкі і моцны алкаголь і не піць на галодны страўнік .

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КУДРЫН: ГРЭЦЫЯ ПАКІНЕ ЕЎРАЗОНУ, А РАСІЮ ЧАКАЕ НЕ МЕНШЫ КРЫЗІС, ЧЫМ У 2008 ГОДЗЕ



Эканамічны крызіс у Еўропе будзе прагрэсаваць, Грэцыя пакіне еўразону, Расія ж рызыкуе ў сувязі з гэтым пражыць не меншы крызіс, чым у 2008 годзе, лічыць экс-міністр фінансаў Аляксей Кудрын.

«Я думаю, што Грэцыя выйдзе ў прынцыпе, дату сказаць не магу», — заявіў ён у кулуарах Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форуму. Па словах Кудрына, сітуацыя ў Еўропе будзе пагаршацца. «Будзе рэцэсія ў цэлым па годзе», — заявіў ён, дадаўшы, што Расія таксама знаходзіцца ў зоне рызыкі. Яшчэ ў сярэдзіне красавіка экс-міністр заяўляў, што верагоднасць развіцця пазыковага крызісу ў Еўропе, зніжэнне росту эканомікі шэрагу еўрапейскіх краін і попыту на нафту яшчэ даволі высокая. «Я думаю, што рызыкі еўрапейскай эканомікі, у тым ліку пазыковага крызісу, яшчэ могуць сыграць. Я гэтаму сцэнару аддаю 40%», — сказаў ён.

Кудрын таксама адзначаў, што буйныя карпарацыі ў Еўропе і свеце такі сцэнар для сябе пралічылі і імкнуцца да яго быць гатовымі.

ВЫБРАНАЯ ПРАФЕСІЯ, ПРАЦА НЕЯК ЗМЯНІЛА ВАШ ХАРАКТАР?

Марына ЁЛІНСКАЯ, галоўны спецыяліст дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, сакратар Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук:

— Да гуманітарных ведаў — гісторыі, літаратуры, а таксама сусветнай мастацкай культуры — мела схільнасць з ранняга дзяцінства. Шмат чытала, займалася музыкай, маляваннем, танцамі. Таму да моманту выбару будучай прафесіі падышла без сумненняў і ваганняў. Гісторыя стала той навукай, якой займаюся ўсё жыццё пасля заканчэння БДУ і як навуковы супрацоўнік у Акадэміі навук, і выкладаючы ў альма-матар. Зараз асноўным аб'ектам працы для мяне з'яўляецца тэарэтычная і практычная геральдыка, якая складае рэдкае гарманічнае спалучэнне магчымага і сапраўднага. Пры гэтым прадмет працы — афіцыйныя геральдычныя сімвалы сучаснай Беларусі — дазваляе штодня адчуваць сябе запатрабаванай. Характар жа з гадамі змяніўся нязначна.

Ксенія ПАНЦЯЛЕЙ, галоўны спецыяліст упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:

— Па прафесіі я — эколаг. І абірала такую спецыяльнасць згодна з маёй цікавасцю да прыроды і сувязяў, якія падтрымліваюць яе раўнавагу.

Аднак зараз я — чыноўнік. Гэта накладвае пэўныя абавязкі, і ў той жа час род дзейнасці ўплывае на мяне саму. Мне даводзіцца шмат працаваць з людзьмі. І я заўважыла, што стала больш стрыманай і ўважлівай. У цэлым жа якасці, выпрацаваныя прафесіяй, мне, хутчэй, дапамагаюць, акрамя, напэўна, маёй... настойлівасці. Апошняя часам хвалюе людзей, якія сустракаюцца са мной упершыню.

Таіса РАБЦЭВІЧ, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце, старшыня прафкама РУП «Уздзенская ЖКГ»:

— Па натуры я — чалавек актыўны, мне неабходна пастаянна рухацца, штосьці рабіць. Дынамічны лад жыцця — мая стыхія, таму сваю сённяшнюю працу я вельмі люблю і паважаю. Як, дарэчы, і ўсе папярэднія. Маю адукацыю філолага, з дзяцінства захапляюся мілагучнасцю роднай мовы, таму ў свой час вырашыла абраць прафесію гуманітарыя.

Увогуле, я люблю зносіны з людзьмі, працаваць у вялікай камандзе, члены якой з'яднаны агульнай задачай. Мой тэмперамент дазваляе мне не стамляцца нават напрыканцы працоўнага дня, які, шчыра кажучы, часам перавышае адведзеныя графікам гадзіны для выканання службовых абавязкаў.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

«Беларусь адбылася як незалежная дзяржава»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што павагі заслугоўваюць незвычайная жыццеўстойлівасць і воля беларусаў, якія змаглі пранесці праз стагоддзі імкненне да дзяржаўнасці і дабіцца пастаўленай мэты.

«Старэйшае пакаленне не забыла Беларусь узору ліхіх 90-х, калі абвалілася эканоміка, калі відавочны быў параліч улады, беспрацоўе і галеча, і мы балансавалі на краі прорвы. Напэўна, Гасподзь нас выратаваў. Мы пачалі шукаць выхад, у тым ліку і палітычны», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

«Я памятаю тыя часы, калі мы фарміравалі Канстытуцыю і ўводзілі пасаду прэзідэнта краіны — прэзідэнта «ўрэзанага», як хацелася многім групам, асабліва эліце. Усе хацелі слабага прэзідэнта, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Прэзідэнта выбралі, і мне давялося мадэрнізаваць Канстытуцыю, дзе прэзідэнт павінен быць прэзідэнтам, каб выцягнуць краіну з прорвы, у якой яна тады знаходзілася». «На шчасце, мне давялося быць прэзідэнтам таго перыяду, калі мы выцягвалі краіну проста за вушы з той багны, у якую мы трапілі», — дадаў ён.

Прэзідэнт канстатаваў, што ў краіне была створана палітычная сістэма, у ёй не адмовіліся ад планавання і прагназавання, створана выканаўчая вертыкаль улады, сфарміраваны парламент.

«Не хачу гаварыць аб асаблівасцях, некаторыя называюць гэта феноменам развіцця нашай краіны. Давайце не будзем вельмі сябе ўзвялічваць. Будзем гаварыць аб тым, што мы развіваліся сваім асаблівым шляхам. Правільна мы рабілі ці не, а мы лічым, што правільна, і я таксама так лічу, але гэта меркаванне сучаснікаў. А нас ацэняць пакаленні, якія прыйдуць пасля нас. Яны нам дадуць ацэнку: правільна мы дзейнічалі ці не», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Але калі ёсць паляпшэнні, значыць, гэта адзін з тых шляхоў, па якім мы павінны былі прайсці», — дадаў Прэзідэнт.

Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці і Прэзідэнцкая бібліятэка павінны быць максімальна даступны грамадзянам, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з экспазіцыяй музея, а таксама з тым, як арганізавана работа Прэзідэнцкай бібліятэкі, наведаў фондасховішча, фонд рэдкіх выданняў.

Аляксандр Лукашэнка фактычна сам правёў экскурсію па музеі, расказаўшы аб асноўных этапах станаўлення краіны, яе сельскай гаспадаркі, прамысловасці, успомніўшы аб яркіх момантах тых гадоў.

Урад возьме пад кантроль рэканструкцыю МТФ у Віцебскай вобласці

Урад возьме пад кантроль ход рэканструкцыі малочнатаварных ферм у Віцебскай вобласці. Аб гэтым паведаміў журналістам у Горках прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, які з рабочай паездкай наведвае Віцебскую і Магілёўскую вобласці.

Паводле слоў кіраўніка ўрада, калі ацэньваць ход работ па рэканструкцыі малочнатаварных ферм па краіне, то Віцебская вобласць значна адстае ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Тут трэба забяспечыць рэканструкцыю 228 сельскагаспадарчых аб'ектаў. На большасці ферм гэта работа ідзе, але гаварыць, што сістэмна, на жаль, не даводзіцца. Таму зроблены шэраг даручэнняў па ўдакладненні праектных рашэнняў, крыніцах фінансавання.

«Мы таксама прынялі кіраўніцкае рашэнне — разбіць Віцебскую вобласць на тры вялікія рэгіёны. Адзін з іх будзе пад маім асабістым кантролем, другі пад кантроль возьме старшыня КДК Аляксандр Якабсон, а трэці — мой намеснік Анатоль Тозік. Я ўпэўнены, што дзякуючы такому сур'ёзнаму патранажу будуць аператыўна вырашацца ўсе праблемныя пытанні і мы справімся ў намечаныя тэрміны з гэтай работай», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Аналагічнае пытанне па ходу рэканструкцыі МТФ было разгледжана і па Магілёўскай вобласці, дзе трэба ўвесці ў строй 162 аб'екты. З іх роўна 100 будуць фактычна новыя фермы, якія складаюцца з двух памяшканняў для жывёлы і малочнага блока. Работы чакаюць вельмі вялікія, але яны апраўдаюць укладзеныя сродкі, таму што ў выніку аграрыі вобласці атрымаюць сучасную матэрыльна-тэхнічную базу малочнай жывёлагадоўлі.

«У гэтай справе магіляўчане малайцы, хоць ім трэба будзе вельмі сур'ёзна і напружана папрацаваць. Мы дамовіліся па ўсіх пытаннях, якія трэба вырашыць у бліжэйшы час, у тым ліку па матэрыяльных і фінансавых рэсурсах. Галоўнае, што на кожным аб'екце ідзе актыўная работа, практычна няма сумненняў, што яна будзе завершана ў тэрмін», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

■ Парламенцкі дзённік

Уладзімір СЯМАШКА:

«Неабходна максімальна выкарыстаць магчымасці АЭП»

Учора урад Беларусі чарговы раз адказваў на пытанні дэпутатаў Нацыянальнага сходу. Такія сустрэчы адбываюцца раз на месяц. Перад інтэрв'ю кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў з дакладам перад народнымі абраннікамі выступіў віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір СЯМАШКА.

Фота БЕЛТА.

Выступленне першага намесніка прэм'ер-міністра складалася з аналізу стану спраў у прамысловай і энергетычнай галінах эканомікі краіны і задач, якія стаяць перад урадам у новых умовах развіцця краіны, якія вызначаюцца стварэннем Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

Уладзімір Сямашка адразу адзначыў, што галоўным макраэканамічным індыкатарам працы беларускай эканомікі ва ўмовах АЭП стала паляпшэнне вынікаў знешняга гандлю. Асноўнай праблемай папярэдніх гадоў было адмоўнае сальда гандлю таварамі і паслугамі, што і вылілася летась у фінансава-эканамічны крызіс. За 4 месяцы 2012 года аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі склаў $34 млрд, у тым ліку экспарту — 18,2 млрд, імпарту — 15,8. Суадносіны станоўчага сальда гандлю таварамі і паслугамі да ВУП склалі 13,4% пры прагнозе на 2012 год — 2,7%. Павялічыліся аб'ёмы экспартных паставак нафтапрадуктаў, грузавых аўтамабіляў, малака і малочнай прадукцыі, сельгастэхнікі і інш.

— Такім чынам практычна вырашаецца наша галоўная эканамічная праблема апошніх гадоў — пераадоленне адмоўнага знешнегандлёвага сальда, — дзяліўся добрай навіной з дэпутатамі віцэ-прэм'ер. — Гэта стала магчымым дзякуючы больш эфектыўнай працы рэальнага сектара эканомікі краіны, двухразоваму зніжэнню ў першай палове 2012 года цэн на імпартаваны прыродны газ і ўрэгуляванню пытанняў супрацоўніцтва ў нафтавай сферы.

Усё гэта забяспечыла станоўчую дынаміку развіцця ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, гандлі, транспарце і сувязі. На што адразу адрэагавалі рэйтынгавыя агенцтвы: Standard & Poor's змяніла прагноз на доўгатэрміновы суверэнны крэдытны рэйтынг Беларусі з «негатыўнага» на «стабільны».

Намінальны ўзровень заробку ў прамысловасці за 4 месяцы сёлета склаў Br3485 тысяч, або $425. Дасягненне ўзроўню заробку $500 да снежня будзе забяспечвацца толькі за кошт росту прадукцыйнасці працы праз стварэнне новых вытворчасцяў і павышэнне эфектыўнасці дзейных, запэўніў Уладзімір Сямашка.

Фота БЕЛТА.

Дзякуючы міждзяржаўным пагадненням, цана на мяжы Беларусі на імпартаваны прыродны газ у 2012 годзе склала $165,6 за тысячу кубічных метраў, што ніжэй за леташні сярэднегадавы ўзровень на 37% і практычна ў два разы ніжэй за прагназаваныя на бягучы год цэны — $330-340 за 1 тыс.куб.м, у выпадку непадпісання міжурадавых пагадненняў.

— Галоўным вынікам работы па энергазберажэнні стала тое, што за 15 апошніх гадоў мы амаль ў два з паловай разы павялічылі ВУП практычна без павелічэння спажывання зыходных энерганосьбітаў, у сваёй масе імпартаваных, — закрануў другі важны аспект у развіцці нашай краіны віцэ-прэм'ер. — У выніку гэтых захадаў мы мэтанакіравана рухаемся да паказчыкаў па энергазберажэнні перадавых краін свету. І калі да Германіі, Францыі і Японіі нам яшчэ далёка, то ў параўнанні з Канадай, якая знаходзіцца ў падобных з намі кліматычных умовах, мы практычна на адным узроўні.

Пры гэтым мерапрыемствы па зніжэнні энергаёмістасці штогод даражэюць. З 2006 года цана эканоміі 1 тоны ўмоўнага паліва ўзрасла амаль утрая — да $960, але гэта — неабходныя выдаткі, аддачу ад якіх Беларусь мае ўжо сёння і яшчэ больш будзе мець у будучыні, калі цэны на імпартаваныя энерганосьбіты непазбежна ўзрастуць.

Такім чынам, Уладзімір Сямашка канстатаваў станоўчыя вынікі працы прамысловасці і энергетычнай сістэмы краіны. Сяроднегадавы тэмп росту прамысловай вытворчасці ў Беларусі за 10 гадоў склаў 108,5% — гэта вельмі высокі паказчык па сусветных мерках, заўважыў першы намеснік прэм'ер-міністра. Паводле статыстычных звестак сайта International Trade Centre (ААН), удзельная вага беларускай прамысловасці ў сусветнай прамысловай вытворчасці павялічылася больш чым ўдвая — да 0,117% па выніках 2010 года.

— Трэба разумець, што ўсе гэтыя гады іншыя рэгіёны свету таксама не стаялі на месцы, — заўважыў дакладчык. — Гэта і ёсць галоўная інтэграваная адзнака эфектыўнасці нашай працы ў прамысловым комплексе.

Асноўнай задачай на доўгатэрміновую перспектыву Уладзімір Сямашка назваў стварэнне па сёлетніх выніках перадумоў для кампенсацыі папярэдняга адставання ў выкананні праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку.

У лёгкай прамысловасці прадугледжана мадэрнізацыя Аршанскага льнокамбіната, Баранавіцкага вытворчага бавоўнянага аб'яднання, будзе практычна занава пабудаваны камбінат «Камволь»...

Для тых прадпрыемстваў, якія шмат гадоў працуюць неэфектыўна, урад бачыць выйсце ў мадэрнізацыі і холдынгавай мадэлі кіравання.

Беларусь плануе ў 2012 годзе стварыць 14 зборачных вытворчасцяў за мяжой, з іх 8 — у Расійскай Федэрацыі. Акрамя таго, у час візіту кіраўніка дзяржавы ў Венесуэлу плануецца адкрыццё яшчэ дзвюх новых зборачных вытворчасцяў — беларускіх трактароў і МАЗаў.

Беларусь мае намер таксама прыкметна пашырыць тавараправодную сетку. «У 2012 годзе плануецца стварэнне 14 суб'ектаў з беларускімі інвестыцыямі за мяжой, у тым ліку ў Расіі — 8, ва Украіне — 3, у Індыі — 2 і ва Узбекістане — 1», — праінфармаваў Уладзімір Сямашка. Стварэнне такіх аб'ектаў плануецца з улікам эфектыўнага развіцця знешняга гандлю айчыннымі прадпрыемствамі.

Аналіз змяненняў умоў работы на знешніх рынках паказвае нарастанне нестабільнасці і нявызначанасці ў краінах як з развітым прамысловым комплексам, так і ў рэгіёнах, якія развіваюцца. Адно з выйсцяў па мінімізацыі знешніх рызык — аб'яднанне намаганняў нацыянальных і замежных вытворцаў праз стварэнне транснацыянальных кампаній і сумесных прадпрыемстваў, адзначыў Уладзімір Сямашка.

Ён нагадаў, што цяпер Беларусь і Расія вядуць перагаворы аб аб'яднанні актываў МАЗа і КамАЗа. Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, аб агульных умовах працы трэба думаць і такім прадпрыемствам, як «Гомсельмаш» і «Растсельмаш», МЗКЦ і ГАЗ. «Ёсць прапанова па ўдзеле ў акцыянерным капітале і развіцці Гомельскага хімічнага завода і «Гродна Азота», на якім запланавана будаўніцтва новага азотнага комплексу коштам больш як $1 млрд», — дадаў ён.

Уладзімір Сямашка досыць канкрэтна і падрабязна адказаў на пытанні дэпутатаў. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ** цікавілася лёсам стратных прадпрыемстваў і наступствамі абмежаванняў з боку Расіі на ўвоз беларускага сухога малака.

Уладзімір Сямашка назваў такія абмежаванні рудыментам, які будзе адсечаны.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Аляксандр ЮШКЕВІЧ прапанаваў увесці адказнасць за безгаспадарлівасць: «Каб не было так, што спачатку паклалі асфальт, а потым пракладаем трубы».

Гучалі пытанні пра рэгуляванне цэн на калійныя ўгнаенні, вытворчасць легкавых аўтамабіляў, спецыяльную адукацыю для бізнэсменаў і экалогію. У асноўным дэпутаты засталіся задаволеныя адказамі віцэ-прэм'ера. Чаго нельга сказаць пра адказы міністраў і іх намеснікаў. Так, Ларыса Вершаловіч, якая спытала старшыню канцэрна «Беллегпрам» пра высокія цэны і незадавальняючую якасць дзіцячай і жаночай вопраткі, пачула ў адказ, што ў нас усё добра.

— Аднак я хаджу ў краму і бачу рэальную сітуацыю, — заўважыла дэпутат.

Пра неадпаведнасць павышэння даходаў насельніцтва з ростам цэн на паліва старшыню канцэрна «Белнафтахім» спытаў **дэпутат Алег КОТ.**

— Я не пачуў адказу на сваё пытанне, — пракаментаваў ён пазней журналістам свой дыялог. — Тым не менш такія сустрэчы і размова з членамі ўрада вельмі карысныя, яны дазваляюць вызначыць болевыя кропкі і абазначыць тэмы для далейшага абмеркавання.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА ■

Лідзія ЯРМОШЫНА:

«Я не чакаю цуду ад прадстаўнікоў АБСЕ на парламенцкіх выбарах»

Парламенцкая выбарчая кампанія 2012 года ў Беларусі ў многім будзе адрознівацца ад папярэдніх выбараў у Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Так, значна спрасцілася працэдура вылучэння кандыдатаў у дэпутаты ў ніжнюю палату парламента. Акрамя таго, прэтэндэнты на парламенцкае крэсла змогуць удзельнічаць у тэледэбатах, накіроўваць на агітацыю сродкі з асабістага выбарчага фонду. Наколькі гэта ажывіць выбарчую кампанію? Ці змогуць кандыдаты з выгадай выкарыстоўваць новаўвядзенні і заручыцца большай падтрымкай электарату? Па якім шляху будзе развівацца беларуская выбарчая сістэма пасля выбараў? Прагнозамі наконт гэтага ў інтэрв'ю БЕЛТА падзялілася старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына.

Фота БЕЛТА.

— Лідзія Міхайлаўна, апошні раз выбарчае заканадаўства ў Беларусі змянялася ў 2010 годзе. Па ім ужо былі праведзены выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў і прэзідэнцкія выбары. Парламенцкія ж будуць праходзіць па зменených нормах упершыню. У чым асаблівасці выбарчай кампаніі-2012?

— Яна будзе больш простай для яе ўдзельнікаў, перш за ўсё для палітычных партый, якім цяпер значна лягчэй вылучаць кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў. Раней трэба было мець у выбарчай акрузе ніжэйшую структуру. Цяпер любая партыя мае права вылучаць сваіх кандыдатаў ва ўсе 110 выбарчых акруг.

Спрошчаны парадак, на якім настойвалі самі партыі, безумоўна, дае ім больш шанцаў, але ў той жа час можа прывесці да дэградацыі партыйных структур. На мой погляд, для партыі існаванне толькі ў выглядзе офіса ў Мінску — гэта маргінальны спосаб існавання.

Раней была неабходнасць мець у выбарчай акрузе сваё падраздзяленне, якое стымулявала б партыю да развіцця, стварэння рэгіянальных структур. Калі іх няма, то кандыдат выбаршчыкам будзе малавядомы і не зможа прыцягнуць вялікую колькасць галасоў. Таму, маючы магчымасць вылучаць прадстаўнікоў па спрошчаным сцэнарыі, партыі не атрымалі гарантыі перамогі на выбарах.

Тыя, хто будзе вылучацца шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў, таксама адчуюць змены. Зборшчыкам подпісаў не трэба завяраць іх у мясцовым выканкаме. Працэдуру спрасцілі. Але ці не прывядзе гэта да злоўжыванняў? Калі подпісы не трэба завяраць, то ці трэба ўвогуле збіраць? Зрэшты, любая фальсіфікацыя на гэтай стадыі дасць магчымасць толькі зарэгістравацца, але не быць выбраным у дэпутаты. А цвярозага розуму кандыдат разумее, што сам па сабе збор подпісаў яму выгадны. Гэта магчымасць прарэкламаваць сябе выбаршчыкам.

— Ці будуць на гэтых выбарах уключаць у склад Цэнтральнай выбарчай камісіі прадстаўнікоў палітычных партый з правам дарадчага голасу? Як вы ацэньваеце эфектыўнасць такой практыкі?

— Так, безумоўна, будуць, паколькі гэта патрабаванне закона. Такая практыка ў Беларусі ўпершыню знайшла прымяненне ў 2000 годзе. Гэта, мабыць, самы яркі прыклад узаемадзеяння ўлады і апазіцыі ў нашай краіне.

Мяркую, што такая практыка дае свой эфект. Але не стану сцвярджаць, што, атрымаўшы права дарадчага голасу, прадстаўнік партыі зможа карэнным чынам змяніць ход выбараў. Кропку ў спрэчных пытаннях ставяць члены ЦВК з правам рашаючага голасу.

У той жа час бясспрэчна, што ўдзел у рабоце Цэнтрвыбаркама прадстаўнікоў палітычных партый станоўча ўплывае на палітычную абстаноўку, якая складваецца ў грамадстве вакол працэсу выбараў, ажыўляе выбарчую кампанію.

— Якіх ацэнак вы чакаеце ад наглядальнікаў АБСЕ?

— Ацэнка прадстаўнікоў АБСЕ яшчэ ні разу не была станоўчай, таму не магу разлічваць на цуд, што раптам яна зменіцца. Ацэнка залежыць не ад працэсу, а ад выніку. Калі АБСЕ не задаволіць вынік выбараў, гэта значыць калі ў парламент не пройдуць прадстаўнікі апазіцыі, то ацэнка будзе адмоўнай, што б мы ні рабілі.

— Па якім шляху будзе развівацца беларуская выбарчая сістэма? Ці магчыма ў будучым стварэнне свайго аптымальнага для Беларусі варыянта, які спалучаў бы рысы мажарытарнай і прапарцыянальнай выбарчых сістэм?

— У палітыцы гнацца за ўнікальнасцю не трэба. Гэта сфера дастаткова кансерватыўная. Трэба карыстацца вопытам, які прайшоў апрабацыю і заведама добра працуе.

У амерыканцаў, напрыклад, ёсць такая прымаўка: «Навошта рамантаваць тое, што яшчэ не зламалася?» А наша выбарчая сістэма не толькі не зламалася, але і нармальна функцыянуе, не выклікаючы нараканняў з боку выбаршчыкаў. Можа быць, яны хацелі б бачыць выбары больш ажыўленымі. Але, як паказвае практыка іншых краін, гэта залежыць не столькі ад удзелу партый, колькі ад канкрэтных персаналій і ад іх фінансавых магчымасцяў. Той, хто мае грошы, можа наймаць паліттэхнолагаў і рабіць больш разнастайнай сваю перадвыбарную агітацыю. Але тады гэта будзе выбарчая кампанія багатых.

Кандыдаты ў дэпутаты ў Беларусі могуць ствараць выбарчыя фонды, але памеры фондаў абмежаваны — да 1 тыс. базавых велічынь, што цяпер складае Br100 млн. Прадугледжана гэта для таго, каб усім кандыдатам прадаставіць прыкладна аднолькавыя ўмовы. Інакш мажарытарная выбарчая сістэма, што дзейнічае ў краіне, пачне служыць класу багатых. Самі выбары ператворацца ў палітычнае шоу, а галасы выбаршчыкаў — у аб'ект куплі-продажу.

Да рэформ выбарчай сістэмы трэба падыходзіць вельмі ўмерана. Лічу, што змешаная сістэма, калі дэпутацкія мандаты падзелены на мажарытарныя і партыйныя, нам не падыходзіць. Акругі ў гэтым выпадку будуць вельмі вялікімі. Дастаткова ўявіць, што ў такім горадзе, як Бабруйск, дзе колькасць выбаршчыкаў складае каля 130 тыс. чалавек, працуе адзін дэпутат. Выбаршчыкі практычна страцяць магчымасць трапіць да яго на прыём.

Больш таго, у няроўных умовах апынуцца і самі дэпутаты. Мажарытарыі нясуць хоць нейкую персанальную адказнасць перад выбаршчыкамі, а тыя, хто прыйшоў у парламент па партыйных спісах, не. Яны звязаны выключна воляй сваёй фракцыі. Але работу парламента патрэбна будаваць па аднолькавых прынцыпах. Таму ў выпадку рэформы трэба выбіраць: або мажарытарная выбарчая сістэма, або прапарцыянальная.

Падкрэслю, што ў Беларусі нічога змяняць не плануецца. Прынамсі, кіраўнік дзяржавы ніколі не паведамляў аб такіх намерах. Больш таго, ён заўсёды падкрэслівае, што цяперашняя мажарытарная выбарчая сістэма не выклікае праблем і поўнасцю адпавядае нашым рэаліям. У яе, безумоўна, ёсць недахопы. Самы галоўны — у адрозненне ад прапарцыянальнай яна не садзейнічае развіццю палітычных партый. Хоць дзяржава ў гэтым вельмі зацікаўлена.

— Чым выклікана гэта зацікаўленасць?

— Няўрадавыя структуры, калі яны займаюць канструктыўную пазіцыю, служаць асновай для самаарганізацыі грамадзян. Дзяржаве намнога прасцей звярнуцца да лідара буйнога грамадскага аб'яднання. У гэтых адносінах цяны няма прафсаюзам, у якія ўваходзіць вялікая колькасць людзей, саюзу жанчын.

Калі ў краіне будуць развівацца партыі, прычым не толькі зверху, але і са стварэннем ніжніх структур у рэгіёнах, то дзяржаве мэтазгодна фінансаваць іх. Тыя, што ўдзельнічаюць у выбарах, маюць фракцыі ў парламенце. І гэта правільна, бо развіваюцца канструктыўныя сілы.

Але цяпер дзяржава ў такіх інвестыцыях не зацікаўлена. Адны з самых актыўных партый у Беларусі — тыя, якія заклікаюць да эканамічных санкцый, шкодзяць уласнай краіне. Фінансаваць такія структуры — гэта своеасаблівы дзяржаўны мазахізм.

У Беларусі партыям прадастаўлена поўная самастойнасць. Іх непапулярнасць ад уласнай безынiцыятыўнасці, нежаданне зарабляць. Таму адны туляцца ў адзіным офісе, у выбарах удзельнічаюць вельмі недасведчана, нават партыйны з'езд правесці не могуць. У выніку ЦВК вымушаны адмовіць у рэгістрацыі іх кандыдатаў. Іншыя ж партыі існуюць за кошт заходняга фінансавання і, адпаведна, праводзяць палітыку сваіх спонсараў.

Лічу, у гэтых парламенцкіх выбарах апазіцыйныя партыі будуць удзельнічаць. Што цалкам зразумела: замежныя інвестары не будуць аплачваць байкот. Гэта супярэчыць заходняй дэмакратычнай этыцы. Але некаторыя беларускія апазіцыйныя лідары на правах кандыдатаў у дэпутаты ўдзельнічаць у выбарах не змогуць з-за непагашанай судзімасці за падзеі снежня 2010 года. Гэтыя грамадзяне змогуць быць толькі выбаршчыкамі.

— Як вы лічыце, ці многа будзе сярод кандыдатаў сапраўды яркіх асоб, папулярных хаця б у сваёй акрузе?

— Праблема ў тым, што многія кандыдаты лічаць, што абавязковага выступлення з перадвыбарнай праграмай па радыё, на тэлебачанні цалкам дастаткова. Прайсці ў парламент некаторыя хочуць толькі за дзяржаўны кошт, таму не працуюць з выбаршчыкамі, не прыходзяць у дварыда бабуль, не арганізоўваюць агітацыйных пікетаў.

У сваю чаргу самі выбаршчыкі часта недапытлівыя і лянівыя. Вось калі недзе паведамяць, што крупы будуць прадаваць па зніжаных цэнах, то ўсе прыйдуць. А на перадвыбарныя сустрэчы практычна ніхто не прыходзіць, ды і перадвыбарныя выступленні мала хто глядзіць.

— А колькі дзеючых дэпутатаў, на ваш погляд, захочуць зноў заняць дэпутацкія крэслы?

— Ідэальны варыянт, калі пераемнасць у парламенце даходзіць да 30 працэнтаў. Колькі дзеючых дэпутатаў вырашаць у гэтым годзе балаціравацца, дакладна не скажу. Лічу за лепшае не каментаваць такія моманты і ўвогуле думаю, што любыя кантакты з кандыдатамі ў перыяд выбарчай кампаніі робяць мяне несвабоднай.

Пачаліся выбары, і ў маім кабінеце няма прыёму, я не прымаю нікога з парламентарыяў, якія плануюць вылучаць сваю кандыдатуру. Чалавек можа толькі трапіць у прыёмную на зваротах грамадзян. Некаторых гэта крыўдзіць. Але я імкнуся быць незалежнай. І, безумоўна, мне хочацца, каб усе кандыдаты адчувалі сябе абсалютна роўнымі.

Патоп на Косаўскім тракце

У Слоніме ўвечары прайшоў моцны дождж. У выніку выпадзення такіх «шчодрых» ападкаў літаральна за паўгадзіны былі падтоплены дзевяць падворкаў.

Адбылося гэта на вуліцах Косаўскі тракт і імя Морыса Тарэза. Глыбіня падтаплення, паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, склала 30-40 сантыметраў. Эвакуацыя насельніцтва не праводзілася. Ужо да апоўначы адпампоўванне вады было завершана на ўсіх падтопленых падворках. Для гэтых работ задзейнічалі сілы і сродкі Слонімскага раённага падраздзялення МНС і брыгаду мясцовага дарожна-эксплуатацыйнага прадпрыемства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

◢ Сельгасарганізацыі Беларусі завяршаюць першы ўкос шматгадовых траў. Паводле звестак на 22 чэрвеня, шматгадовыя травы першым укосам скошаны на 1249,1 тыс.га (94,3 працэнта запланаванай плошчы). У Брэсцкай вобласці заданне выканана на 100 працэнтаў.

◢ **У выхадныя па ўсёй Беларусі Дзяржаўтаінспекцыя будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. ДАІ будзе кантраляваць выкананне хуткасных рэжымаў, фізічны стан кіроўцаў і выкананне правілаў пешаходамі. Пад асаблівым кантролем будуць знаходзіцца: аўтадарогі М-1 Брэст — Мінск — мяжа РФ, М3 Мінск — Віцебск, М5 Мінск — Гомель, М4 Мінск — Магілёў, Р23 Мінск — Мікашэвічы, Р28 Мінск — Маладзечна. Сіламі Мінскай ДАІ арганізуецца адпрацоўка МКАД.**

Поўны абзац

◢ У Маскве невядомы ўгнаў пазадарожнік Audi Q7, пакуль кіроўца ратаваў жанчыну з ракі. Вадзіцель Volvo S60, які ехаў з жонкай, не справіўся з кіраваннем. Іншамарка наскочыла колам на бардзюрны камень і, прабіўшы агароджу, упала ў Яўзу. Пры гэтым кіроўцу зацяснула ў салоне. Індывідуальны прадпрымальнік з Падмаскоўя, які ехаў міма, пакінуў свой аўтамабіль незамкнутым і кінуўся ратаваць людзей. Яму ўдалося выцягнуць на бераг толькі пасажырку Volvo, яе муж загінуў. У гэты час невядомы злачынец сагнаў аўто ратавальніка коштам каля 2,9 млн расійскіх рублёў. Быў уведзены план «перахоп», але вынікаў ён не даў.

◢ **48-кілаграмовага сома-гіганта даўжынёй у чалавечы рост завудзіў у рацэ Стыр Руслан Ябланчук з Луцку (Украіна). Гіганцкая рыбіна клюнула на жыўца — 300-грамовага карася. З сомам вопытнаму рыбалову давялося змагацца паўгадзіны. «Яму не пашанцавала, што я стаяў на абрыве і некалькі разоў змог узняць яго ў вадзе вертыкальна, а самы такога не любяць», — расказаў Руслан. Калі велікана ўдалося выцягнуць на бераг, рыбак настолькі стаміўся, што мусіў легчы адпачыць побач з уловам. Акрамя мегатрафея, за два дні рыбалкі ён налавіў «па дробязі» каля 80 кг ляшчоў, язёў, галаўнёў і іншай рыбы.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

■ Здарэнні, крымінал

Загінуў хлопчык

У Баранавіцкім раёне патануў 10-гадовы школьнік. Ён купаўся разам з двума прыяцелямі ў возеры каля пасёлка Жамчужны. У нейкі момант дзеці пачалі тануць. Двое мужчын, якія непадалёку лавілі рыбу, паспяшаліся на дапамогу. Дваіх выцягнулі, аднаго не паспелі. Яго цела знайшлі пазней вадалазы.

У Ганцавічах выратавальнікі выцягнулі з вады 7-гадовага хлопчыка. Яго маці ненадоўга аслабіла ўвагу, але гэтага хапіла, каб дзіця пачало тануць. На шчасце, супрацоўнік адпаведнай службы хутка зарыентаваўся.

Яна СВЕТАВА.

Вежавы кран «абчысцілі»

У Оршы з вежавага крана ўкралі дваццаць метраў кабелю.

Вечарам у Аршанскі гарадскі аддзел унутраных спраў патэлефанавалі з адміністрацыі будаўнічага прадпрыемства і паведамілі, што з вежавага крана, які знаходзіцца на будаўнічай пляцоўцы, укралі дваццаць метраў кабелю. Шкоду ацанілі на суму 5,6 мільёна рублёў.

Міліцыяй было ўстаноўлена, што злачынства здзейснілі двое хлопцаў (1995 і 1996 гадоў нараджэння), якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ ■

Научно-методическое учреждение
«Национальный институт образования»
Министерства образования Республики Беларусь

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2012 ГОД

ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА БЮДЖЕТНОЙ ОСНОВЕ ПРОВОДИТСЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

09.00.11 – социальная философия (1 место, дневная форма получения образования);
13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования (2 места, из них 1 место – дневная форма получения образования, 1 место – в форме соискательства);
13.00.02 – теория и методика обучения и воспитания (9 мест, из них 2 места – дневная форма получения образования, 1 место – заочная форма, 6 мест – в форме соискательства);
13.00.03 – коррекционная педагогика (2 места, из них 1 место – заочная форма получения образования, 1 место – в форме соискательства);
19.00.01 – общая психология, психология личности, история психологии (1 место в форме соискательства);
22.00.06 – социология культуры (1 место, дневная форма получения образования).

Срок обучения: дневная форма – до 3-х лет, заочная форма – до 4-х лет, соискательство – до 5-ти лет, соискательство для сдачи кандидатских экзаменов – до 2-х лет.

Прием документов: с 1 августа по 30 сентября.

Прием осуществляется на конкурсной основе с 1 по 31 октября.

Начало занятий для аспирантов дневной и заочной форм получения образования – 1 ноября.

Лица, поступающие в аспирантуру, должны иметь высшее образование; склонность к научным исследованиям, научные публикации; рекомендацию ученого совета (совета) учреждения высшего образования или факультета этого учреждения (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

Поступающие в аспирантуру в дневной и заочной формах получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.

Поступающие в аспирантуру для обучения в заочной форме получения образования и в форме соискательства, за исключением обучения в форме соискательства в целях сдачи кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам, должны иметь опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

ПРИЕМ В ДОКТОРАНТУРУ НА БЮДЖЕТНОЙ ОСНОВЕ ПРОВОДИТСЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТИ

19.00.07 – педагогическая психология (1 место в форме соискательства).

В докторантуру принимаются лица, имеющие ученую степень кандидата наук и являющиеся авторами научных статей, других материалов, отражающих результаты научных исследований, которые составляют основу для докторской диссертации с возможностью ее завершения в течение трех лет.

Срок обучения в форме соискательства – до 5-ти лет.

Прием документов: с 1 августа по 30 сентября.

Прием осуществляется на конкурсной основе с 1 по 31 октября.

ПОДГОТОВКА ДОКТОРОВ И КАНДИДАТОВ НАУК НА ПЛАТНОЙ ОСНОВЕ осуществляется по всем специальностям обучения.

Срок обучения: до 5-ти лет.

С условиями приема можно ознакомиться в аспирантуре и докторантуре (каб. № 110) и на сайте **(www.adu.by)** Национального института образования.

Документы направляются по адресу: Национальный институт образования, аспирантура и докторантура, **ул. Короля, 16, 220004, Республика Беларусь.**

Телефоны для справок: **8 (017) 200 53 38, 229 19 59.**

УНП 190374888

Дирекция института

МЕДЫЦЫНА НАСУПЕРАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Сёння фундаментальнае вывучэнне і практычнае прымяненне ствалавых клетак пад сілу толькі такім буйным медыцынскім цэнтрам, як Рэспубліканскі Цэнтр гематалогіі і трансплантацыі касцявога мозга, які пачаў сваю работу на базе 9 гарадской клінічнай бальніцы амаль 20 гадоў таму, — лічыць **намеснік галоўнага ўрача 9-й клінікі, доктар медыцынскіх навук Анатоль УС**. — Нашы вынікі лячэння захворванняў крыві адпавядаюць стандартам рэгістра Еўрапейскага таварыства трансплантацыі касцявога мозгу, членам якога Цэнтр з'яўляецца з 1994 года. Інфармацыя пра колькасць выкананых трансплантацый у Беларусі перадаецца ў Швейцарыю. Мы паспяхова прымяняем трансплантацыю ствалавых клетак пры лячэнні злаякасных новаўтварэнняў, розных формаў лейкозу і іншых хвароб крыві, рассеянага склерозу.

Аперацыйная з ламінарнымі патокамі паветра аперблока Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Са студзеня 2010 года на базе 9-й клінікі арганізаваны **Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансплантацыі органаў і тканак, якім кіруе Алег РУМО**. З таго часу тут праведзена 129 трансплантацый печані. За мінулы год у Цэнтры былі перасаджаны 175 нырак, 43 печані, 2 падстраўнікавыя залозы.

— Цэнтр з'яўляецца вяршыняй хірургічнай службы клінікі, — пракаментаваў дэпутатам структуру сваёй установы **галоўны ўрач 9-й клінічнай бальніцы Валерый КУШНІРЭНКА**. — Ён цесна звязаны з іншымі аддзяленнямі. Акрамя таго, у нас адкрыта некалькі структурных падраздзяленняў, якія забяспечваюць падбор органаў і тканак для трансплантацыі. Гэта лабараторыя HLA-тыпавання (вызначэння сумяшчальнасці. — **Аўт.**), лабараторыя клетачных біятэхналогій — цалкам новая і адзіная структура ў краіне, якая можа вылучаць клеткі, рыхтаваць іх і выкарыстоўваць для лячэння пацыентаў.

Клініка фарміруе ліст чакання са звесткамі пра хворых, якім паказана трансплантацыя. Для службы гематалогіі створаны Гарадскі рэгістр донараў касцявога мозга і ствалавых клетак, які сёлета стане рэспубліканскім. Для тых пацыентаў, у якіх ёсць донар-сваяк (маці, бацька, дзеці), які падыходзіць па генатыпе, усё значна прасцей, тлумачаць трансплантолагі. Але часта бывае, што сваякі не падыходзяць альбо не жадаюць выступаць донарамі. Тады патрэбна вялікая група добраахвотнікаў, у якіх будуць вызначаны крытэрыі сумяшчальнасці, і якія ў выпадку неабходнасці будуць гатовыя выступіць донарамі касцявога мозга. Стварэнне Рэспубліканскага рэгістра донараў важна і таму, што пошук донара за мяжой каштуе каля 16 тысяч долараў. Сёння ў Гарадскім рэгістры донараў касцявога мозга і ствалавых клетак ёсць даныя каля 8 тысяч чалавек.

У 2010 годзе ўдзел 9-й клінікі ў экспарце медыцынскіх паслуг Мінска склаў 30%. Толькі па трансплантацыю сюды звярталіся жыхары Казахстана, Узбекістана, Украіны, Туркменіі, Таджыкістана, Арменіі, Грузіі, Літвы, Латвіі, Расіі, Малдовы, а таксама Іарданіі, Македоніі, Кіпра, Ірана, Ізраіля і Карэі. Сёння ў лісце чакання на трансплантацыю органаў даныя 20 замежных грамадзян. Ад 20 да 50 тысяч долараў каштуе перасадка ныркі, ад 40 да 80 — печані, да 120 тысяч — касцявога мозгу. Летась клініка зарабіла на аказанні паслуг замежным грамадзянам 3 млн долараў.

Дэпутаты былі прыемна ўражаны ўсім убачаным і пачутым, аднак іх цікавілі не толькі дасягненні.

— Мы прыйшлі, каб даведацца, якія існуюць праблемы ў заканадаўчым плане, — звярнуўся да кіраўніцтва клінікі **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар ГУМІНСКІ**. — Над чым Міністэрству аховы здароўя і дэпутацкаму корпусу трэба працаваць, каб стварыць умовы для яшчэ больш якаснага аказання медыцынскай дапамогі?

Прэзумпцыя згоды, якая сёння існуе ў заканадаўстве Беларусі, дазваляе развіваць транспланталогію ў нашай краіне досыць якасна, запэўнілі ўрачы, прагрэсіўнымі з'яўляюцца і нормы, якія датычацца канстатацыі смерці мозга донара, даверу спецыялістам, якія робяць забор органаў. Аднак застаюцца і «старыя» праблемы ў гэтай галіне медыцыны.

— 20 гадоў таму клініка пачала займацца праблемай транспланталогіі, — звярнуў увагу дэпутатаў Анатоль Ус. — І 20 гадоў таму, і тры гады таму, калі мы прыступалі да чарговага этапу, праблема была адна і тая ж — знайсці не проста таленавітую моладзь, але моладзь, якая ведае замежныя мовы. Калі сёння выпускнікам медуніверсітэта наладзіць іспыт па замежнай мове, 90% яго не пройдуць. Гэта балючае пытанне для ўсіх, бо размова ідзе пра адпаведнасць сусветнаму ўзроўню. А мы часам выназодзім веласіпед.

Экстранная дапамога

У **Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі** штогод пралечваецца каля 38 тысяч чалавек. Асаблівасць другой медыцынскай установы, якую наведалі дэпутаты падчас семінара, у тым, што яна ў кругласутачным рэжыме аказвае экстранную медыцынскую дапамогу па такіх пазіцыях, як нейрахірургія, сумешчаная траўма, таксікалогія і хірургія. Акрамя таго, на базе клінікі працуе Рэспубліканскі апёкавы цэнтр. Тут функцыянуе адно з самых буйных прыёмных аддзяленняў у краіне, разгорнуты 70 рэанімацыйных ложкаў. Тры дні ў тыдзень бальніца працуе па аказанні медыцынскай дапамогі пры вострым каранарным сіндроме.

— Аб'ёмы мы павялічваем. Гэта дарагі від лячэння, аднак ён адпавядае сусветным стандартам, — расказаў дэпутатам **галоўны ўрач клінікі Вячаслаў ШЫЛА**. — Пацыент, у якога здарыўся інфаркт, па хуткай дапамозе паступае адразу ў рэанімацыю. Першую дапамогу ён атрымлівае яшчэ ў машыне, потым трапляе ў кабінет ангіяграфіі, дзе выконваецца рэнтгеналагічнае даследаванне каранарных сасудаў і ў залежнасці ад сітуацыі — іх стэнціраванне (пашырэнне прасвету сучаснымі метадамі для аднаўлення кровазабеспячэння міякарда. — **Аўт.**).

Такая дапамога пры інфаркце дазваляе звесці да мінімуму яго наступствы і не проста выратаваць жыццё, але і захаваць яго якасць. Аднак яна дае эфект, толькі калі аказана ў кароткі прамежак часу пасля пачатку сардэчнага прыступу. Таму вельмі важна, каб чалавек своечасова прыняў рашэнне пра выклік «хуткай» і каб уся медыцынская сістэма спрацавала бездакорна. З моманту пачатку хваробы да аперацыйнага стала павінна прайсці не больш за 90 хвілін, падкрэсліваюць кардыяхірургі.

Не толькі пры вострым каранарным сіндроме, але пры неабходнасці любой экстраннай медыцынскай дапамогі самы малы збой у сістэме аховы здароўя можа каштаваць чалавечага жыцця. Нездарма дэпутаты зноў і зноў пыталіся пра набалелае.

— Ёсць праблемы з кадрамі медсясцёр, — пацвердзіў галоўны ўрач, — але ўказ Прэзідэнта, які выйшаў 1 студзеня, дазволіў забяспечыць прыток сярэдняга медперсаналу ў самыя цяжкія аддзяленні — рэанімацыю і інтэнсіўную тэрапію. Там высокатэхналагічныя маніпуляцыі, цяжкая праца, таму заробак вышэй, чым у звычайнай палатнай медсястры. Заробак медсястры ў рэанімацыі складае каля 6 млн.

— Што вы думаеце пра грэйдавую сістэму аплаты працы? — пацікавілася ў кіраўніцтва бальніцы **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Антаніна МОРАВА**. — Калі аплата залежыць не ад адпрацаванага часу, а ад кваліфікацыі.

Год таму гэтаму хлопчыку з Жодзіна была зроблена перасадка печані, донарам стала маці.

Аказалася, што гэтая сістэма пакуль мала знаёмая нашым медыкам і яны не гатовы каментаваць яе прымяненне. Яшчэ адна праблема, пра якую зайшла гаворка падчас парламенцкага семінара, датычылася імпартазамяшчэння расходных матэрыялаў. Адно з самых вострых пытанняў — памперсы, прычым не толькі для дзяцей. На другой пазіцыі па актуальнасці — рэактывы для лабараторый адкрытага тыпу.

Спыталі дэпутаты і меркаванне людзей у белых халатах пра страхавую медыцыну.

— Ніхто з постсавецкіх дзяржаў, за выключэннем Расійскай Федэрацыі, не ўвёў медыцынскае страхаванне, — звярнулі ўвагу заканадаўцаў урачы. — Германія і Францыя, якія з'яўляюцца апалагетамі медыцынскага страхавання, паціху пераймаюць нашы меры бюджэтнай аховы здароўя. Таму наша прапанова — правы медустаноў пашырыць, заробак прывязаць па-іншаму, каб загадчык аддзялення атрымліваў больш, але асноўныя прынцыпы павінны заставацца ранейшымі. На жаль, урачы і Міністэрства фінансаў па рознаму бачаць задачу рэформаў у сістэме аховы здароўя. Для нас гэта — павышэнне якасці медыцынскай дапамогі, для Мінфіна — эканомія, змяншэнне выдаткаў. Калі мы ўвядзём глабальны бюджэт і клініка зэканоміць 2 млрд рублёў, яна на наступны год не атрымае гэтых двух мільярдаў. Трэба, каб эканомія заставалася ў межах той установы і сістэмы, якія яе забяспечылі.

Менавіта эканоміі датычылася і пытанне пра адключэнне апаратаў жыццезабеспячэння ў «безнадзейных» выпадках рэанімацыйных аддзяленняў, дзе кошт ложка-месца складае каля 2 млн рублёў у суткі.

— Калі вы маеце на ўвазе эўтаназію, то мы ніколі не прымаем такія рашэнні, — патлумачыў дэпутатам **загадчык аддзялення рэанімацыйна-інтэнсіўнай тэрапіі для нейрахірургічных хворых Сяргей КОМЛІКАЎ**. — Гэта пытанне не рэаніматолагаў і ўрачоў, а грамадства.

Нараджэнне

Трэцяя медустанова, якую наведалі дэпутаты, аказалася самай маладой і самай пажаданай з пункту погляду звароту ў яе па дапамогу — **Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця»**.

Цэнтр быў адкрыты ў лістападзе 2004 года шляхам злучэння двух навукова-даследчых інстытутаў з Сёмай клінічнай бальніцай. Сёння гэта — самы сучасны перынатальны цэнтр беларускай службы аховы мацярынства і дзяцінства. Тут працуюць больш за 1200 супрацоўнікаў, ёсць навуковы і клінічны аддзелы. У складзе апошняга — 563 стацыянарныя ложкі, з іх 30 — дзіцячай рэанімацыі, самай магутнай у краіне, бо тут сканцэнтраваны найбольш цяжкія роды і найбольш «праблемныя» дзеці.

— Акрамя таго, у Цэнтры ёсць кансультатыўна-дыягнастычнае аддзяленне, якое наведваюць каля 800 чалавек за змену. Цэнтр распрацоўвае ўласныя навуковыя тэхналогіі і ўкараняе іх у практыку аховы здароўя, распаўсюджвае на рэгіёны дзякуючы зладжанай сістэме аказання медыцынскай дапамогі жанчынам і дзецям, кадраваму патэнцыялу і стану матэрыяльна-тэхнічнай базы, — прадставіў сваю ўстанову **дырэктар Цэнтра РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін ВІЛЬЧУК**. — Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы мы сёння маем досыць добрыя вынікі: паказчык смяротнасці сярод немаўлятак за 4 месяцы гэтага года склаў 3,5 праміле — самы нізкі з усіх краін СНД. Паказчык мацярынскай смяротнасці — 0,9 на 100 тысяч народжаных жывымі — таксама адпавядае ўзроўню высокаразвітых краін.

Гэтая медустанова адрозніваецца ад падобных па аснашчэнні, бо тут вядуць цяжарнасць, роды і пасляродавы перыяд у жанчын, якія маюць цяжкую сардэчна-сасудзістую паталогію, захворванні эндакрыннай сістэмы і аутаімунныя захворванні. У Цэнтры ўпершыню ў краіне сталі выкарыстоўваць інсулінавыя помпы для хворых на цукровы дыябет цяжарных жанчын.

З 2007 года ў Цэнтры працуе аддзяленне дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, якое выкарыстоўвае ўсе сучасныя тэхналогіі, што існуюць на сённяшні дзень у свеце. Працэнт наступлення цяжарнасці досыць высокі — да 42%.

Дыягнастычныя метады, якімі валодае клініка, дазваляюць своечасова дыягнаставаць прыроджаныя анамаліі развіцця плода і як мага раней перарываць цяжарнасць. Разам з тым, тут выходжваюць дзяцей з 500-грамовай вагой цела, створаны два аддзяленні для аказання дапамогі дзецям з пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы. Дзякуючы гэтым мерам у краіне адбываецца зніжэнне паказчыка дзіцячай інваліднасці і павялічэнне сацыяльнай адаптаванасці такіх малых.

У сценах РНПЦ «Маці і дзіця» цалкам заканамерным было пытанне дэпутатаў пра нядаўна прыняты Закон пра дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі, сурагатнае мацярынства, партнёрскія роды і роды на даму.

— Калі закон пра ДРТ прапрацуе некаторы час, будзе бачна, наколькі ён якасны, — асцярожна заўважыў дырэктар Цэнтра. — Пакуль жа часта ўзнікаюць пытанні фінансавай дапамогі сямейнай пары для выкарыстання дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій: магчымасць атрымання крэдыту, бязвыплатнай спробы падсадкі эмбрыёнаў.

Для вядзення партнёрскіх родаў цэнтр абсталяваў спецыяльны пакой. Калі жанчына не мае паталогіі, роды не ўскладненыя, то партнёрскія роды апраўданыя, лічаць урачы. Ёсць парадзіхі, якія маюць патрэбу ў псіхалагічнай падтрымцы з боку блізкіх людзей.

Што тычыцца родаў на даму, то медыкі катэгарычна супраць. «Неапраўданая рызыка, — кажуць яны. — Мы змагаемся за кожнае жыццё. Падчас родаў могуць узнікнуць ускладненні, пры якіх выратаваць жанчыну, якая нараджае па-за сценамі клінікі, нерэальна». Менавіта таму большасць клінічных акушэраў лічаць папулярызацыю хатніх родаў злачынствам і выказваюцца за ўвядзенне адказнасці за рэкламу хатніх родаў.

— Мы сёння перакананыся ў тым, што ідзём па правільным шляху, — рэзюмаваў вынікі семінара Віктар Гуміньскі. — Якасць медыцынскай дапамогі ў медыцынскіх цэнтрах, якія мы наведалі, уражвае. Важна, што ўрачы-практыкі, у прынцыпе, задаволены тымі законамі, што былі прыняты апошнім часам. Толькі ў Чацвёртым скліканні мы прынялі каля 10 законаў у галіне аховы здароўя. Разам з тым, мы перакананыся ў тым, што работы яшчэ шмат...

Дарэчы, у Цэнтры «Маці і дзіця» дэпутатам расказалі пра тое, што прадстаўнікі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ніяк не маглі паверыць, што наш паказчык па смяротнасці сярод немаўлятак рэальны. Яны такія ж, як і ў Швецыі, дзе сума на ахову здароўя ў разліку на аднаго жыхара перавышае беларускую ў 15 разоў. Нашы ўрачы змаглі даказаць, што паказчык рэальны. Калі б замежныя эксперты чулі словы майго ўніверсітэцкага выкладчыка, яны б не здзівіліся...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

УРА! КАНІКУЛЫ!

Бераг Плешчаніцкага вадасховішча сабраў самых таленавітых, мэтанакіраваных і мужных дзяўчат і хлопцаў Міншчыны.

Там нядаўна завяршыў сваю працу чарговы, ужо дзявяты па ліку абласны палявы лагер «Юны выратавальнік», а таксама злёт Мінскага абласнога аддзялення Беларускай моладзевай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных. 22 каманды прынялі ўдзел у цікавых і карысных конкурсах — бег па бервяне, што знаходзіцца ў вадзе, воднае манеўраванне, тарзанка, кіданне выратавальнага круга, аказанне даўрачэбнай дапамогі і іншыя. Удзельнікі злёту прадэманстравалі навыкі выжывання і ўменне арыентавацца ў незнаёмай мясцовасці. А яшчэ за чатыры дні падлеткі паспелі і пасябраваць, бо зорнае неба і песні каля вогнішча запомняцца надоўга. Прынамсі, да наступнага года, калі будзе разбіты чарговы палявы лагер.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Лагойскі раён.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

«СЛАБЫЯ ЗВЁНЫ» ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ

Валютная выручка павінна вяртацца своечасова

Чаму на шэрагу прадпрыемстваў не выконваюць даручэнне кіраўніка дзяржавы па своечасовым вяртанні валютнай выручкі? Пытанне скарачэння знешняй дэбіторскай запазычанасці разгледжана на пасяджэнні Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці з удзелам прадстаўнікоў органаў улады і кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў.

Летась і за студзень—красавік гэтага года парушэнні парадку ажыццяўлення знешнегандлёвых аперацый выяўлены ў 35 арганізацыях, якія прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму 7 мільярдаў рублёў. Пакараны штрафам 44 службовыя асобы, заведзены 3 крымінальныя справы. Разам з тым, падкрэслівае Камітэт дзяржкантролю, штрафныя санкцыі — не самамэта. Галоўнае — вызначыць праблемныя пытанні, якія негатыўным чынам уплываюць на парадак разлікаў за экспартныя пастаўкі.

Гэта найперш безадказнасць кіраўнікоў пры заключэнні дагавораў паставак, рэалізацыя прадукцыі на ўмовах значнай адтэрміноўкі плацяжу. Асобныя прадпрыемствы не абцяжарваюць сябе папярэднім зборам і аналізам інфармацыі аб фінансавым стане і дзелавой рэпутацыі пакупнікоў, не карыстаюцца магчымасцямі страхавання экспартных рызык. Акрамя таго, не прымаюцца належныя меры па дасудовым і судовым урэгуляванні спрэчак, што ўзнікаюць падчас выканання знешнегандлёвых дагавораў, не прад'яўляюцца штрафныя санкцыі. Таксама сярод слабых звёнаў — узровень кваліфікацыі спецыялістаў маркетынгавых службаў прадпрыемстваў-экспарцёраў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА — У ЛЕТНЯЙ ШКОЛЕ

Міжнародная летняя школа беларускай мовы будзе арганізавана з 25 чэрвеня па 7 ліпеня на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Яе ўдзельнікамі стануць студэнты, магістранты і аспіранты з ВНУ Расіі, Украіны, Польшчы і Сербіі. На практычных занятках маладыя людзі будуць вывучаць беларускую мову або ўдасканальваць свае веды ў ёй. У праграму ўключаны таксама экскурсіі па гістарычных мясцінах Мінска і Беларусі, наведванне музеяў і іншых культурных цэнтраў, сустрэчы з дзеячамі беларускай культуры і навукі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СНАРАД У ШКОЛЬНЫМ ПАДВАЛЕ

Пры правядзенні земляных работ у падвале чатырохпавярховага будынка сярэдняй школы № 127 па вуліцы Берута ў сталіцы быў знойдзены мінамётны снарад.

Боепрыпас меў калібр 81 міліметр і, як было ўстаноўлена, адносіўся да перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Супрацоўнікі МНС разам з адміністрацыяй школы эвакуявалі з будынка 27 чалавек. Балазе, дзяцей тут ужо не было. Снарад вывезлі з падвала для знішчэння на палігоне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Рэверс з сеціва

«БЕДНЫЯ ЎРАЧЫ І БЕДНЫЯ ПАЦЫЕНТЫ»

У нумары «Звязды» за 16 чэрвеня быў надрукаваны артыкул Надзеі Нікалаевай «Абараніць і падстрахаваць урача. На карысць пацыента», які актыўна абмяркоўваўся ў інтэрнэт-прасторы. Цытуем адны з самых цікавых меркаванняў наконт узнятых у інтэрв'ю са старшынёй Беларускай асацыяцыі ўрачоў праблем.

@ Максімыч:

...Страхавацца ўрач будзе за свае грошы? А асацыяцыя ўрачоў — атрымліваць працэнт з дагавораў са страхавымі кампаніямі? Таму асацыяцыя і прапіхвае гэты праект. На самой справе страхаваць сваю адказнасць павінны працадаўцы ў асобе ўстаноў аховы здароўя.

@ Vishenka_09:

Камеры патрэбныя ў кожным кабінеце. Можа, пацыенты ў гэтым выпадку пачнуць думаць, перш чым сказаць. Наконт заробкаў: каб зарабіць 4 мільёны, трэба працаваць не менш, чым на 1,5 стаўкі, практычна без выхадных.

@ Acad.val:

Згодны, камеры трэба паставіць. Хоць бы для таго, каб канфліктаў было менш. А то адзін неадэкватны пацыент раззлуе ўрача, а той потым на ўсіх іншых хворых «адрываецца».

@ Alisonfelix:

Камера дысцыплінуе абодва бакі, бо здараецца, што і хворыя церпяць ад вострага языка ўрачоў. Кажуць, што, калі ўстанавілі камеры на мытні, крымінальныя праявы там зменшыліся. І ў савецкія часы ўрачы працавалі на 1,5 стаўкі — інакш не выжыць. Відаць, такі ў нас лёс.

@ Dr.yashka:

Між іншым, правіла «ёсць скарга — трэба пакараць» працуе па-ранейшаму. І нікога не цікавіць, што скарга неабгрунтаваная. Заканадаўча ўрачы па-ранейшаму не абароненыя.

@ Alisonfelix:

Пакаранні на неабгрунтаваныя скаргі мала адрозніваюцца ад пакарання за істотныя правіннасці, звязаныя з жыццём чалавека.

@ Vitiger:

Хопіць ужо стагнаць на тэму «бедныя ўрачы». Гэта ўжо даўно не так і вядома кожнаму пацыенту, які мае няшчасце наведваць паліклініку або бальніцу. Там на самым бачным месцы інфармацыйнага стэнда са спасылкай на арт.546 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь недвухсэнсоўна ўказваецца мінімальны памер хабару: «Не дапускаецца дарэнне, за выключэннем звычайных падарункаў, кошт якіх не перавышае ўстаноўлены заканадаўствам пяціразовы памер базавай велічыні:....2) работнікам лячэбных, выхаваўчых устаноў, устаноў сацыяльнай абароны і іншых аналагічных устаноў — грамадзянамі, якія знаходзяцца ў іх на лячэнні, утрыманні ці выхаванні, мужам, жонкай і сваякамі гэтых грамадзян». А ў клініцы рэальнага лячэння не атрымаеш, пакуль на руку не дасі...

@ Polli10584:

Сапраўды, прыносяць шакаладкі, цукеркі, але ж я іх у пацыентаў не вымагаю...

@ Alisonfelix:

У нас вечная цякучка, да хірурга і гінеколага не трапіць. Спецыялісты працуюць на 1,5 стаўкі. За 11 гадзін прыёму прымаюць больш як сотню хворых. Паспрабуйце проста павітацца і развітацца з такой колькасцю людзей. Бедныя ўрачы, бедныя хворыя.

З пункту погляду пацыента, безумоўна, мне не патрэбны замучаны доктар. А з пункту погляду ўрача — урач павінен мець права выбіраць, якую колькасць гадзін яму ўзяць звыш стаўкі. У нас жа, у сувязі з дэфіцытам кадраў, адміністрацыя задзейнічае ўсе свае каральныя рэсурсы, каб прымусіць маладога спецыяліста працаваць па такім варварскім графіку.

@ Tulpe80:

Можна было б падаць добры прыклад маладым спецыялістам і самому добраахвотна паехаць працаваць урачом куды-небудзь далей, гадоў на пяць.

@ Vvlevch:

Добра ў мяккім крэсле з добрай зарплатай разважаць, як трэба жыць маладым спецыялістам.

@ Zdr.fed:

Калі яшчэ 5 гадоў адпрацоўваць прыйдзецца, то падрыхтую сабе ўцёкі яшчэ перад інтэрнатурай.

@ Капітан Беларусь:

У сферы медыцыны тэрмінова патрэбная канкурэнцыя. А ва ўрача, асабліва ў «вузкіх» спецыялістаў павінна быць хоць нейкая альтэрнатыва ў рабоце, акрамя змены прафесіі ў корані.

@ 2478:

«Не даць перарасці вострай паталогіі ў хранічную». А пазбавіць (вылечыць) пацыента ад вострай паталогіі галоўны ўрач паліклінікі не спрабаваў? Іншымі словамі, «мы не вылечым, мы створым такія ўмовы лячэння, пры якіх вы будзеце звяртацца да нас з зайздроснай рэгулярнасцю».

@ Nadin-monro:

Адкуль такая лічба наведванняў паліклінік? Я не сустракаў ні аднаго знаёмага, які б ахвотна хадзіў у паліклініку. Гэтая лічба, відаць па ўсім, набягае за кошт уколаў, а не наведванняў урачоў. Аб абразах: настаўнікаў не толькі абражаюць, але і б'юць, і яны не вешаюць на дзвярах сваіх класаў падобныя папярэджванні. Гэта проста смешна.

@ Alisonfelix:

Знаёмыя розныя бываюць: хто і неахвотна ідзе, а хто раз на тыдзень абавязкова адзначыцца. Паліклініка як вулей. Добра, што вы туды рэдка ходзіце. Так трымаць!

@ Kot.i.k:

З-за таго, што ў бабуль няма клубаў па інтарэсах, я што, павінен буду выстаяць яшчэ адну чаргу, каб аплаціць сваё наведванне?

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

«ПАДУШКА БЯСПЕКІ» ДЛЯ ШКОЛ — УДЗЕЛЬНІЦ ЭКСПЕРЫМЕНТУ З ФІНАНСАВАННЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На думку членаў рабочай групы ЦК па вывучэнні магчымага пераходу на іншую сістэму аплаты працы, новая сістэма фінансавання, што дзейнічае ў Расійскай Федэрацыі, мае шэраг недахопаў.

— Безумоўна, у Маскве сітуацыя выглядае прывабна, паколькі ў расійскай сталіцы ёсць рэальныя сродкі для падтрымкі работнікаў адукацыі. І новая сістэма ўводзілася там з істотным павелічэннем фінансавання, — падкрэсліў Аляксандр Бойка. — Еўрапейскі досвед сведчыць, што пераход на тую ж штатна-акладную сістэму суправаджаўся там павелічэннем узроўню заработнай платы педагагічных работнікаў больш чым у 1,5 раза і ўвядзеннем дадатковых бонусаў. Таму, па нашым меркаванні, пераход на штатна-акладную сістэму аплаты працы без дадатковага фінансавання прывядзе толькі да зніжэння кошту ўрока. А гэта фактычна новая рэформа ў сістэме адукацыі, ад якіх мы, падаецца, ужо адмовіліся.

Зноў-такі звяртаючыся да досведу нашых суседзяў, трэба адзначыць, што набыццё там школамі фінансавай самастойнасці пацягнула шэраг негатыўных момантаў, звязаных з прамым прымяненнем да сістэмы адукацыі законаў рынкавай эканомікі. Пры новай сістэме фінансавання выйграюць школы буйных гарадоў, найбольш вядомыя гімназіі і ліцэі. Падушавы нарматыў значна адрозніваецца ў залежнасці ад рэгіёна, тыпа ўстановы, іх геаграфіі і напаўняльнасці. Ён можа быць розным нават у рамках аднаго рэгіёна, дзе можа дзейнічаць адначасова да 70 нарматываў! Яшчэ адзін відавочны мінус — у Расіі актывізаваліся ліквідацыя малакаплектных школ, аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі. Наступствам гэтага працэсу стала скарачэнне работнікаў галіны, перш за ўсё намеснікаў кіраўнікоў устаноў, настаўнікаў хіміі, фізікі, выхавальнікаў груп падоўжанага дня, псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, вучэбна-дапаможнага і абслуговага персаналу. У многіх расійскіх рэгіёнах увогуле адмовіліся ад груп падоўжанага дня. Іх стварэнне было ўключана ў нарматыў, як і павышэнне педагогамі кваліфікацыі.

«СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...»

На думку **старшыні Мінскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Мікалая БАШКО**, сістэма аплаты працы, якая дзейнічае сёння ў Беларусі, хоць і не дасканалая, але далёка не самая дрэнная. Гэтая сістэма стымулюе педагогаў да павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі, яна сацыяльна арыентаваная (падтрымлівае педагогаў, якія працуюць у сельскай мясцовасці), хоць і не высокая. Сёлета за студзень—красавік у педработнікаў яна склала 77,7 % ад сярэдняй заработнай платы ў прамысловасці. І калі асноўную частку работнікаў сістэмы дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі хвалюе, калі распачнецца паэтапнае павышэнне заработнай платы, то спецыялістаў, якія за гэта адказваюць, хвалюе, які механізм удасканалення аплаты будзе вызначаны.

— Унутраныя крыніцы павышэння заработнай платы за кошт рэарганізацыі сеткі ўстаноў адукацыі малаэфектыўныя і могуць прывесці да негатыўных сацыяльных наступстваў, — папярэдзіў Мікалай БАШКО. — Для прыкладу, у Мінскай вобласці за перыяд з 2005 года было ліквідавана 187 школ, або 25% ад агульнай колькасці. На 15% скарацілася колькасць настаўнікаў-прадметнікаў і амаль на 30% — колькасць навучэнцаў агульнаадукацыйных школ. Вырашаць пытанне з працаўладкаваннем педагогаў ліквідаваных школ становіцца ўсё больш праблематычна. **Так, на сустрэчы з педагогамі адной са школ, якая закрываецца ў гэтым годзе, давялося пачуць словы адчаю з вуснаў настаўніка з амаль 25-гадовым стажам работы: «Няўжо я заслугоўваю знайсці прымяненне сваіх сіл толькі ў якасці даяркі?»**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі Мінскага і Віцебскага абкамаў прафсаюза таксама выязджалі ў Расію для вывучэння сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў Смаленскай вобласці. У адпаведнасці з законам Смаленскай вобласці, на Смаленшчыне рэгіянальныя нарматывы фінансавага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці дзяржаўных устаноў адукацыі зацвярджаюцца ў залежнасці ад тыпу ўстановы (для гарадскіх адукацыйных устаноў, сельскіх, агульнаадукацыйных школ-інтэрнатаў, школ-інтэрнатаў для дзяцей-сірот і дзяцей-сірот, што засталіся без бацькоўскай апекі, санаторных школ-інтэрнатаў і гэтак далей). Нарматывы ўключаюць у сябе выдаткі па аплаце працы работнікаў вышэйназваных устаноў, выдаткі на падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, тэхнічныя сродкі навучання, расходныя матэрыялы і гаспадарчыя патрэбы (за выключэннем выдаткаў на ўтрыманне будынкаў і камунальных выдаткаў). Гэтыя нарматывы не зацвярджаюцца для сельскіх малакамплектных устаноў з колькасцю навучэнцаў да 100. Варта адзначыць, што за апошнія гады пры падтрымцы кіраўніцтва вобласці малакамплектныя сельскія школы на Смаленшчыне не закрываліся. А ў суседняй Пскоўскай вобласці за кароткі час закрылася каля 200 агульнаадукацыйных устаноў.

«У нарматыў будуць уключацца толькі тыя выдаткі, ад якіх залежыць якасная арганізацыя адукацыйнага працэсу, таму асноўную яго частку (ад 90 да 96%) будуць складаць выдаткі на заработную плату»

Разлік рэгіянальных нарматываў на аднаго навучэнца ў год ажыццяўляецца па кожным муніцыпальным утварэнні Смаленскай вобласці. Пры гэтым улічваецца меркуемы рост заработнай платы і каэфіцыент павышэння выдаткаў на падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, тэхнічныя сродкі навучання, расходныя матэрыялы і гаспадарчыя патрэбы. Нарматывы не з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі, іх памер зацвярджаецца, зыходзячы з магчымасцяў бюджэту, і методыка іх разліку аналагічная разліку дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне адукацыі ў Беларусі.

— Па меркаванні педагогаў і прафсаюзнага актыву Смаленскай вобласці, пераход на падушавое фінансаванне адукацыйных устаноў не з'яўляецца мэтазгодным. Ён прывядзе да зацікаўленасці ўстаноў у перапоўненых класах, да незапоўненых вакансій, стрымлівання працэсу атрымання педработнікамі больш высокіх катэгорый і іншых негатыўных наступстваў. Таму мяркую, што ў гэтай сітуацыі трэба кіравацца народнай мудрасцю: «Сем разоў адмерай — адзін раз адрэж», — дадаў Мікалай Башко.

ЦІ БУДУЦЬ ЭКСПЕРЫМЕНТАВАЦЬ НАД СЕЛЬСКІМІ ШКОЛАМІ?

Начальнік упраўлення сацыяльна-эканамічнага развіцця Міністэрства адукацыі Ірына БЕБЕХ агучыла папярэднія высновы рабочай групы па вывучэнні пытанняў магчымага пераходу на іншую сістэму аплаты працы педагагічных работнікаў, якія працуюць пры Міністэрстве адукацыі. У гэтую групу ўвайшлі не толькі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, але і міністэрстваў фінансаў, працы і сацыяльнай абароны, работнікі апарата Савета Міністраў, Гомельскага і Гродзенскага аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

— Натуральна, усіх хвалюе, наколькі паспешліва будзе ўкараняцца новы механізм фінансавання, таму хачу ўсіх заспакоіць: мы цудоўна разумеем, наколькі гэта адказны крок, — паведаміла Ірына Бебех. — **Разумеем таксама, што нельга слепа капіраваць** чужы досвед. Увогуле наша краіна — асаблівая, з традыцыйна моцнай сацыяльнай падтрымкай. Згодна з папярэднім рашэннем рабочай групы, нарматыў будзе аднолькавы для ўсіх 23 устаноў адукацыі, задзейнічаных у эксперыменце, незалежна ад рэгіёна. **Вырашана, што ўдзельнічаць у эксперыменце будуць дванаццаць сталічных устаноў адукацыі, шэсць гродзенскіх і пяць гомельскіх школ.** У зацверджаны нарматыў не будуць уваходзіць выдаткі на капітальны, бягучы рамонт, на набыццё абсталявання, камунальныя выдаткі і выдаткі на харчаванне навучэнцаў. Асноўную ж частку нарматыву (ад 90 да 96%) будуць складаць выдаткі на заработную плату. Як мы разважалі? Незалежна ад таго, колькі ў школе будзе навучацца дзяцей (500 ці 1,5 тысячы), будынак школы ўсё роўна трэба ўтрымліваць, ацяпляць, рамантаваць яго і гэтак далей. Таму было прынята рашэнне ўключаць у нарматыў толькі тыя выдаткі, ад якіх залежыць якасная арганізацыя адукацыйнага працэсу. Эксперымент распачнецца з 1 студзеня і не паставіць настаўнікаў у складанае становішча. З Міністэрствам фінансаў у нас ужо дасягнута дамоўленасць, што для школ, задзейнічаных у эксперыменце, будзе вызначана так званая «падушка бяспекі» — адаптацыйная надбаўка. Мы свядома адмовіліся ад карэктуючых каэфіцыентаў на карысць адаптацыйнай надбаўкі, якая дазволіць падтрымаць фінансаванне ўстановы адукацыі на ўзроўні гэтага года з прымяненнем макраэканамічных паказчыкаў. Эксперымент ні ў якім разе не павінен пагоршыць становішча педагогаў.

Акрамя таго, па словах Ірыны Бебех, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, якія стануць эксперыментальнай пляцоўкай для абкаткі новага механізму фінансавання, атрымаюць права ўсе зэканомленыя па камунальных артыкулах грошы накіроўваць на стымуляванне працы. Таксама ў іх будзе магчымасць перагледзець і

«Пераход на штатна-акладную сістэму аплаты працы без дадатковага фінансавання прывядзе толькі да зніжэння кошту ўрока. А гэта фактычна новая рэформа ў сістэме адукацыі...»

штатны расклад і, калі ў гэтым будзе патрэба, скараціць пэўныя штатныя адзінкі. Разам са сваім калектывам кіраўнік будзе зацвярджаць крытэрыі, па якіх будзе ацэньвацца эфектыўнасць працы кожнага работніка.

— Пакуль мы не можам казаць пра тэрміны правядзення эксперыменту — тры гады ці пяць, — дадала Ірына Бебех. — Да работы над стварэннем новага механізма фінансавання сёння падключаны як работнікі Нацыянальнага інстытута адукацыі, так і Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, дзе ажыццяўляецца навуковы праект. Але мы ўсе разумеем, што навука можа разыходзіцца з рэчаіснасцю. Работа ідзе паралельна над штатна-акладнай сістэмай працы і над распрацоўкай галіновай сістэмы аплаты працы. Магчыма, што паралельна, на базе адной—дзвюх устаноў, паспрабуем абкатаць яшчэ і галіновую сістэму аплаты працы. Аднак рэзкіх крокаў ніхто рабіць не збіраецца.

Многіх удзельнікаў пленума цікавіла, а ці не пацерпяць ад укаранення новага механізму фінансавання сельскія школы і, адпаведна, іх вучні і педагагічныя калектывы, калі школы будуць і далей закрывацца.

— Сельскія школы мы задзейнічаць у эксперыменце не плануем. Больш за тое, у дачыненні да сельскіх школ, магчыма, увогуле нарматыў прымяняцца не будзе, — заспакоіла Ірына Бебех.

АДМОЎНЫ ВЫНІК — ТАКСАМА ВЫНІК

Удзел у пленуме Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ўзяў таксама **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід КОЗІК,** які напрыканцы таксама выказаў сваю думку наконт той інфармацыі, што прагучала з трыбуны:

— Адукацыя — тая сфера, дзе заўсёды спрабуюць праводзіць эксперыменты. Але, на жаль, на заробках педагогаў гэта ніяк не адбіваецца: заробкі растуць ад выпадку да выпадку. Таму я лічу, што ўрад проста абавязаны разгледзець да 1 верасня пытанне аб павышэнні заробкаў педагогам. Шчыра кажучы, я не ведаю, на чым можна ў школе зэканоміць. Хіба што на бляшанцы з фарбамі? Эксперыменты, безумоўна, маюць права на жыццё, і адмоўны вынік эксперыменту — таксама вынік. Галоўнае — каб пры гэтым не пагоршылася матэрыяльнае і сацыяльнае становішча настаўніцтва, каб не закрываліся школы...

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Тры пытанні да ўлады

ЧАГО ХОЧУЦЬ АЛЬШАНЦЫ

ЖЫХАРЫ вёскі Альшаны Столінскага раёна даўно набылі вядомасць у краіне як шчырыя працаўнікі, адданыя сваім сем'ям і роднай мясціне. Усяго хапае ў Альшанах. Не хапае толькі зямлі, каб кожны мог далей развіваць уласную гаспадарку так, як ён хоча. Гэтая тэма становіцца галоўнай на ўсіх сустрэчах з прадстаўнікамі ўлады — ад мясцовых чыноўнікаў да кіраўніцтва краіны. Пра гэта — нашы пытанні старшыні Столінскага раённага выканаўчага камітэта Рыгору ПРАТАСАВІЦКАМУ.

— Калі зямля на Століншчыне галоўная каштоўнасць, можа, настаў час увесці дадатковы падатак на зямлю?

— Вырашэнне такіх пытанняў — у кампетэнцыі заканадаўцы. А я не стаў бы спяшацца з прапановамі ў гэтым кірунку. Альшанскія гаспадары плацяць падаткі ў адпаведнасці з дзейнымі ў краіне законамі. Акрамя таго, павялічваючы таваразварот многіх арганізацый, яны ў пэўным сэнсе плацяць ускосны падатак. Патлумачу больш падрабязна. І для пачатку — рытарычнае пытанне: калі дзве альбо тры тысячы чалавек, якія забяспечваюць сваіх родных працай ва ўласных цяплiцах, сёння пакінулі б гэты занятак і сталі патрабаваць работу, мы іх забяспечылі б працоўнымі месцамі? Не. Таму да гэтых людзей трэба ставіцца з асаблівай павагай і ўвагай. Яны маюць вялікія сем'і. Паводле даўняй вясковай традыцыі, бацькі будуюць дамы кожнаму з дзяцей. А калі ў сям'і пяць, а то і дзесяць дзяцей — значыць, будуецца дзесяць дамоў. Для гэтага трэба купіць будаўнічыя матэрыялы, потым аддзелачныя, мэблю, бытавую тэхніку. За грошы, зароблены ў цяплiцах, набываюцца адзенне, прадукты, прадметы ўжытку. Усё пералічанае — гэта даходы нашых гандлёвых арганізацый і падаткі ў казну. Прыкладна 80% агародніны, вырашчанай на гэтай зямлі, ідзе за межы краіны, што аўтаматычна цягне за сабой прыток валюты. Таксама станоўчы момант.

Таму да пастаўленага вамі пытання варта аднесціся вельмі ўважліва: трэба спачатку ўсё пралічыць, узважыць, каб не прымаць рашэнняў, якія з часам давялося б пераглядаць.

— На ўсіх узроўнях гаварылася, што адным са шляхоў вырашэння «зямельнага пытання» можа стаць пераезд альшанцаў на новыя месцы. Чаму ж тутэйшых людзей так цяжка зрушыць з месца?

— Каб зрушыць іх, як вы кажаце, з месца, трэба змяніць свядомасць. А яна мае рэлігійны ўплыў, фарміравалася многімі дзясяцігоддзямі. Напрыклад, у 1986 годзе альшанская абшчына Хрысціян веры Евангельскай была самая вялікая ў Савецкім Саюзе. Гэта пры тым, што тагачасная ўлада іх усяляк уціскала. А цяпер, калі вернікі атрымалі сапраўдную свабоду веравызнання, яны ўзвялі свой малітоўны дом, што па колькасці месцаў перавышае раённы Дом культуры. Яны не п'юць, узорна працуюць. Іх абшчына — найбольшая ў Беларусі. Камфортна ж яны адчуваюць сябе толькі ў асяродку аднадумцаў і адзіноверцаў. Альшанцы — людзі асаблівага менталітэту, іх вёска — як асобная краіна. Таму да іх нельга падыходзіць са звычайнымі меркамі.

— Ці ўкладвае дзяржава сродкі ў развіццё інфраструктуры Альшанаў з іх 7-тысячным насельніцтвам?

— Укладвае, і не малыя. Летась увялі ў строй новую школу. Заасфальтавана крыху больш за 10 кіламетраў дарог. Вядзецца газіфікацыя другой паловы вёскі... Увогуле, за апошнія чатыры гады на добраўпарадкаванне аграгарадка Альшаны пайшло 72 мільярды рублёў бюджэтных сродкаў.

Гаспадары сядзіб, якіх у гэтай вёсцы дзве з паловай тысячы, самі праводзілі — ускладчыну — ямачны рамонт дарогі, цяпер арганізоўваюць кааператывы па газіфікацыі і водазабеспячэнні сваіх дамоў. Гэта той выпадак, калі рэзервы па пашырэнні грамадскага ўдзелу ў агульным дабрабыце ёсць.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

І НІЯКАЙ УДЗЯЧНАСЦІ

Начальнік Тураўскага аддзялення міліцыі Генадзь Матарас разам з інспектарам крымінальна-выканаўчай інспекцыі Надзеяй Масла позним вечарам выехалі па выкліку ў дом, дзе, па словах суседкі, адбывалася нешта нядобрае.

Як толькі супрацоўнікі міліцыі зазірнулі ў памяшканне, з дзвярэй паваліў дым. Малодшая з дзвюх жанчын, жыхарак гэтага дома, якая сядзела недалёка ад увахода, была на добрым падпітку. Пра маці патлумачыла, што «тая дзесьці ў хаце». Пакуль старшы лейтэнант Масла выцягвала першую грамадзянку на вуліцу, маёр Матарас кінуўся на пошук другой. Знайшоў яе ў адным з пакояў, на ложку, таксама п'яную, і прымусова выцягнуў з хаты. Супрацоўнікі МНС, якія прыехалі на месца здарэння, завяршылі тушэнне агню, пачатае міліцыянерамі. Медыкі канстатавалі ў жанчын лёгкую ступень атручвання чадным газам. Між тым, грамадзянкі былі вельмі незадаволены пільнай увагай спецыяльных службаў да іх асоб. Яны так і не зразумелі, што на гэты раз смерць была за крок ад іх.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

А ЗА «КЛУБНІЧКУ» АДКАЖА

Супрацоўнікамі транспартнай міліцыі па месцы жыхарства быў затрыманы 20-гадовы непрацуючы вясковец з Аршанскага раёна, які адшукваўся за тое, што з камп'ютара на перагаворным пункце «Белтэлекам» у будынку аршанскага чыгуначнага вакзала размясціў у інтэрнэт-рэсурсе «УКантакце» тры файлы, якія змяшчаюць інфармацыю парнаграфічнага характару.

Цікава, што падчас следства гэты аматар «клубнічкі» схаваўся ад праваахоўных органаў — з'ехаў у Расійскую Федэрацыю на заробкі.

Акрамя ўсяго іншага, было высветлена, што малады чалавек не толькі распаўсюджваў «гарачыя ролікі», але і здзейсніў некалькі крадзяжоў на тэрыторыі Аршанскага раёна, за што таксама будзе адказваць перад судом. Злодзею пагражае агульнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 4 гадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.



Стымул

Мы з мужам пабраліся шлюбам шмат гадоў таму, на пачатку лета. Жылі спярша ў маіх бацькоў, і тады штовечар (такая завядзёнка ў вёсцы была) хадзілі на лаўку — пасядзець, навіны пачуць, пагаманіць. І, вядома ж, заўважыць, што, як толькі сцямнее (ну хоць ты гадзіннік звярай!), з нашай вёскі ў суседнюю, на новенькім «Мінску», Янак бабулі сырадой вязе.

— А між іншым, без правоў... Непарадак, — прызнала неяк лаўка. — Трэба было б правучыць.

Не доўга думалі, як? Звычайную палку памерам з міліцэйскае жазло пафарбавалі ў чорна-белы колер, прыбралі майго мужа ў армейскую фуражку, цёмную куртку з каўняром, каб трохі твар прыкрыць, цёмныя штаны... Засталося вызначыць, у якім жа месцы яго паставіць, бо трэба ж, каб і нам тое чутна было. Увесь «маршрут» перабралі.

А нашу і суседнюю вёскі раздзяляла невялічкая рэчка.

Карацей, калі стала цямнець, муж мой на сваім матацыкле з каляскай заехаў на мост, стаў там, уключыў «габарыты». Мы ж, уся кампанія з лаўкі, сабраліся пад мостам, стаіліся (аж піск камарыны чуваць) і сядзім — чакаем...

Чуем — нясецца той «Мінск». Бліжэй, бліжэй да нас пад'язджае. Муж здалёк «жазлом» яму: «А ну спыніся!». Той, вядома ж, па тармазах... «Даішнік» да яго (не падыходзячы блізка):

— Інспектар Рыдак. Вашы правы!

У хлопца (потым казаў) вочы ад страху па яблыку, а не бачыць нічога — толькі зубамі ляпае... Горш за тое: сюды ж, да моста, адзін з нашых вяскоўцаў на мапедзе ляціць. Але ж згледзеў, што нейкія разборкі тут, што газай пахне, і як крутнецца на ўсе 180, як дасца ў кусты! І заціх...

Мы пад мостам аж зайшліся ад рогату.

Ну і муж за намі — не ўтрымаўся, выдаў сябе.

— Вой, Сеня, гэта ты? — пытаецца ў яго матацыкліст. — От добра!.. Каб я знаў, дык бутэльку ўзяў бы.

— А ў цябе хіба ёсць? — пытаецца муж. — То вязі, бо ты ж ведаеш — ад «даішнікаў» адной не адкупіўся б: без правоў ездзіш — раз, хуткасць перавышаеш — два...

Як там ні было, а новых сустрэч з «даішнікамі» (нават ліпавымі... Не кажучы ўжо пра сапраўдных) хлопец, відаць, пабаяўся, а таму вельмі хутка здаў на правы. Што цікава — з першага разу!

Л.А.

Нясвіжскі раён.

На працу — з агеньчыкам

Мая чарговая гісторыя — з сумных часоў, часоў так званага новага прыгону — ну, калі селянін працаваў ад цямна да цямна, а яму за гэта «нічога не было» (апроч «палачак»). А «мінімум» — выпрацуй. І нарыхтуйкі — мяса, малако, яйкі, масла, нават скуры свіней — дзяржаве здай. І аблігацыі — зноў жа дзяржаўнага займу — «добраахвотна» выкупі. А за якія, прабачце, шышы? На тых «палачках» грошы ж не растуць...

Зрэшты, дзяржава таксама пра людзей клапацілася. Тады вось, напрыклад, яна ці не ўсіх вырашыла абуць у гумовыя боты, бо вельмі ж вялікія сілы былі кінуты на вырошчванне кок-сагызу (травяністай каўчуканоснай расліны). З-за яе, праклятай, вясковыя дзеці матуль, можна сказаць, не бачылі — тыя сыходзілі досвета і прыходзілі поцемну.

Але ж фасону, як кажуць, не гублялі: смяяліся, спявалі, хоць і з рызыкай «загрымець», складалі вершы ды прыпеўкі. Сама помню (гадкі ў чатыры) падхапіла дзесь словы «серп і молат — смерць і голад», прыдумала да іх нейкую мелодыю, хаджу па дварэ і спяваю...

Галоўнае — не спыніць (Сталіна ўжо не было, але ж страх пякельны застаўся) — ні ўгаворамі, ні пагрозамі... Пад «хатнім арыштам» бацькі трымалі, пакуль словы песні забылася.

Зрэшты, да справы.

Падчас таго кок-сагызу адна з нашых лучынскіх баб узяла (гэта ж жах які!) ды... праспала. Падхапілася — што рабіць? Трэба і на працу не спазніцца (на балота за чатыры вярсты), і ў печы прапаліць (дзецям есці зварыць — большыя пакормяць меншых), і скаціну агледзець...

Карацей, цапу-лапу яна, адна нага тут, другая там — неяк управілася. З печы палавінку гарбуза выцягнула. За яе — і ў каробку з почапкай, бо трэба ж і самой у абед нешта з'есці.

А далей — фуфайку *на* плечы, каробку *за* плечы і ў бок балота. Бабы ж ужо далёка зайшлі. Дык Мар'я за імі... Бегла, бедная — аж іскры ўваччу.

— Вой, — кажа, — бабачкі, ледзь вас дагнала. — Так засаплася, так угрэлася...

— Ну, — смяюцца тыя, — нават пара з ватоўкі ідзе... Ці, можа, дым?..

Прынюхаліся — сапраўды:

— Што ў цябе за спіной? — пытаюць. — Ці не гарыш ты?

Мар'я каробку з сябе, а яна ўжо да плячэй прагарэла, у фуфайцы дзірка з кулак.

Аказваецца, да таго гарбуза нейкі вугольчык прыстаў, і, пакуль Мар'я бегла, ён пакрысе разгараўся.

— А я ж і чула, што ў плечы пячэ, — тлумачыла ўсім кабета, — але ж думала, што гэта ад бегу, што я так угрэлася...

Жанкі ўсё разумелі і, вядома ж, спачувалі (бо стамілася баба і патрэбную рэч прапаліла...). А яшчэ — яны рагаталі і з год пасля пыталіся: ці ўхапіла ж яна жару, ці паклала ў сваю каробку?

І выраз тады ж прыдумалі: калі нехта вельмі спяшаўся, сталі казаць: «Што ты бяжыш, як Мар'я на кок-сагыз?».

Адным словам, цяжка людзі жылі, на рабоце «гарэлі», але сабе не здраджвалі. Можа, таму і выжылі?

Соф'я КУСЯНКОВА.

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Пра Сашу і Глашу

У вёсцы, згадзіцеся, на кані сёння той, хто коніка мае. Чарга на яго (асабліва вясной, калі ўсе бульбу садзяць, ці восенню, калі выбіраюць) — што да начальства таго: запіс — за месяц. І гэта пры ўмове, што грошы плаціш, «чарку» наліваеш і араць гатовы нават пры месяцы... А што яшчэ застаецца, калі ты ў той вёсцы — адрэзаны кус: залятаеш хіба на суботу-нядзелю. Альбо — у адпачынак...

Карацей, сёлета з пасадкай бульбы нам яўна не шанцавала: і ў адны выхадныя «з канём не дамовіліся», і ў другія, і на трэція — холад з дажджом. Але ж мы на ўсякі выпадак прыехалі...

І добра зрабілі, бо не паспелі спыніцца — сусед, як прывід, узнік. І з катэгарычным: «Глашка (так яго кабылку завуць) сёння свабодная, так што можаце браць... Альбо зараз, альбо не ведаю калі».

Што было рабіць? Успомнілі стары анекдот (памятаеце — цешча зяцю: «Як хочаш круціся, але ж каб пахаваў мяне ля Крамлёўскай сцяны!» Ён ёй: «Мама, як хочаце круціцеся, але ж трэба памерці: пра ўсё дамоўлена — пахаванне заўтра ў 15)...

А ў нас — конь. Сёння. Нават ужо...

Патэлефанавалі сябрам (гэта, дзякаваць Богу, блізка, да таго ж цяпер ці не ў кожнага аўто, хоць дрэнненькае), клікнулі на падмогу суседку — праз нейкую гадзіну былі на сотках. Там жа размеркавалі, хто будзе ў баразне, хто — у плузе, а каму кабылку вадзіць...

Вось гэту, апошнюю аперацыю, даверылі Сашу, бо любіць ён жывёлін — любых (што, мусіць, рэдкасць для мужчын?). Ну, камара, яшчэ можа прыбіць, калі дужа «дастане», а вось заляцеўшую муху — не. Хіба паганяе, пакуль тая фортачку знойдзе... Можа яшчэ газеткай пад зад падпіхнуць: ляці, маўляў, гуляй... Што ўжо казаць пра котку, якую летась у спёку нехта зачыніў на балконе дзявятага паверха. Нікога не кранала яе адчайнае мяўканне... Апроч Сашы. Той паўмікраёна на ногі паставіў, але ж свайго дамогся: котку выратавалі. Мы потым жартавалі: «Ці не яна табе ў знак удзячнасці маленькую хамячыху прынесла?

Але ж котка коткай, а тут па досыць цяжкай глебе трэба было вадзіць не вельмі маладую і не вельмі дужую кабылку, якая, мабыць, не адзін раз пашкадавала, што нарадзілася ў вёсцы. І таму Саша, каб падбадзёрыць жывёліну, найперш пагладзіў яе па шыі і пяшчотна прапанаваў: «Ну, Глаша, пайшлі. Цяжка табе, разумею. Але ж круг-другі пройдзем — трошкі адпачнеш...»

Маша, якая ад нараджэння свайго чула ад мужчын хіба мацюкі, недаверліва бліснула вокам, пастрыгла вушамі, памаляла галавой і паволі пайшла.

Зямля падымалася цяжка, імжэў халаднаваты дождж, і таму на другім-трэцім крузе, шкадуючы, Саша зноў пагладзіў кабылчына вуха, сказаў: «Малайчына, Глаша... Ты працаўнічка, ты разумніца, ты прыгажуня...».

Вось гэтае казаць, мусіць, не трэба было, таму што Глаша, пачуўшы добрыя словы, вы яшчэ прамоўленыя з пяшчотай, спачатку стала ў баразне як укапаная, а потым і наогул паклала Сашу галаву на плячо. І ні сярдзітае «Но, пайшла!», ні ўзмахі рукою (нават з дубцом) не маглі скрануць яе з месца. Калі ж Саша з уздыхам прызнаў, што ўсе жанчыны аднолькавыя — іх толькі прылашчы, Глаша і ўвогуле згодна заплюшчыла вочы і прыціснулася мордай да Сашавага сцягна — прычым намертва!

Мы пакаціліся ад рогату. Мужыкі, выціраючы слёзы, спыталі, ці не пакінуць іх удваіх у гэтым садзе-агародзе...

Карацей, замест трох гадзін бульбу мы садзілі ўсе пяць, бо Глаша, не зважаючы на смех, раз-пораз замірала, прыпадала да Сашавага пляча, шумна ўздыхала... Ну як было парушаць гэтую ідылію?

...Зараз канец чэрвеня. Бульба дзе па разу, дзе па два ўжо абагнаная. У Глашы — цудоўныя вольныя дні, цёплыя і доўгія. Па выхадных мы бачым яе: карціна бязмежнага чэрвеньскага лугу, на якім пасуцца коні, згадзіцеся, дарагога вартая! Таму Саша любіць пастаяць ля акна. А мы тады — успомніць пасадку бульбы і пасмяяцца: маўляў, глядзі — Глаша табе хвастом махае... Відаць, сэрцам чуе, што ты прыехаў...»

І хто яго ведае — можа, так яно і ёсць?

Надзея ПЛЯСКОВІЧ.

г. Бабруйск.

Без віны вінаваты

...Ці не ў кожнае навагоддзе мы глядзім кіно пра тое, як герой Мягкова трапляе ў новы дом на вуліцу Будаўнікоў, але не ў Маскве, а ў Ленінградзе.

Нешта падобнае адбылося і ў нас, але не ў горадзе Леніна, а ў вёсцы...

Значыць, жыве ў нас адзін чалавек. Як многія, на вялікі жаль, любіць выпіць. А ў той вечар яму і наогул «пашчасціла»: досыць добра намурзаўся — ледзь дадому паўзе. Але ж прыкмячае, што з вуліцы ў двор звярнуў, а Шарык нават не гаўкнуў. «Во, — думае, — разгультаіўся, во разбэсціўся — гаспадара свайго сустракаць перастаў!»...

І жонка, бачыць, не чакае: святла няма, дзверы знутры замкнёныя.

Стукаць не стаў: адагнуў цвічкі, выцягнуў шыбу — улез праз акно.

А далей — справа звычная: разуўся, на хаду скідаючы адзенне, рушыў у спальню. Толькі дайшоў да ложка, толькі ўпаў і ногі выпрастаў — віск з-пад боку... Ды дзікі, жаночы... Падскочыў як абвараны! Уключыў святло. Суседка на ложку — у сцяну ўціснулася, коўдру на сябе нацягнула, вочы вырачыла і крычыць.

— Ты чаго тут? — здзівіўся ён.

— Гэта ты чаго? — плача кабета. — Гэта мой ложак, мой дом!

Азірнуўся Іван — сапраўды... Заблудзіўся ён (ліха ім, тым жодзінцам, што пасля Чарнобыля набудавалі перасяленцам аднолькавых хат).

Хмель як рукою зняло. Таропка нацягнуў нагавіцы, ускінуў іншае адзенне, стаў прасіць:

— Волька, ты прабач! Ранавата я з вуліцы звярнуў, дом пераблытаў... Ты ж хаця не кажы нікому. На смех падымуць...

Вольга накінула на сябе халацік, вывела «госця» з хаты. Іван — з удзячнасці — ёй нават шыбу на месца паставіў, пайшоў дамоў.

У сваім двары яго сустрэў Шарык (і ніякі ён не гультай)...

А вось дзверы і тут былі замкнёныя. Таму «фокус» з шыбаю давялося паўтарыць яшчэ раз. І ўлезці ў акно. Ціхенька, каб не пабудзіць ліха (у выглядзе жонкі), ён пракраўся ў спальню, асцярожненька, на краёчку, лёг. І тут жа пачуў:

— П'яніца ты праклятый... Дзе ж цябе чэрці насілі? І калі ты ўжо нап'ешся? Калі перастанеш мне нервы рваць? Каб табе смалы якой налілі, каб ты...

Дзіўная справа: чуў Іван гэтую «песню» — можа, сто разоў! Але ж рады быў толькі зараз! Пад гэтую калыханку сваёй жонкі, дома, на сваім ложку цалкам шчаслівым ён засынаў.

А калі прачнуўся, уся вёска ўжо ведала пра яго начны візіт: Волька, выганяючы ў поле карову, не ўцярпела — усё расказала суседкам. Таму іх мужы праз гадзіну-другую, вітаючы візіцёра, ужо казалі яму: «З лёгкай парай, блудны Іван».

З той раніцы гэтая мянушка да яго і прыляпілася. А між іншым, дарэмна, бо не распуснічаў ён. І нават не хацеў... Тут — як у кіно: будаўнікі ва ўсім вінаваты. І, вядома ж, гарэлка.

Не кажучы ўжо пра Чарнобыль.

Дзіна Канстанцінаўна ДУБАДЗЕЛАВА,

в. Леніна, Добрушскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

«ОЙ, Я СТАМІЛАСА ДЫ ПАВАЛІЛАСА»

Ігуменскі тракт

або Ці з'явіцца ў традыцыйнай хаце сакуноў чацвёртае акно?

МНОГІЯ нашы суайчыннікі ў пошуку новага, нязведанага едуць за мяжу. І няўцям ім, што і ў роднай Беларусі можна знайсці шмат цікавага і адметнага. Напрыклад, у Старадарожскім раёне, што на Міншчыне, у вёсцы Залужжа жывуць самабытныя людзі — сакуны ці, дакладней, іх нашчадкі. Сакунамі карэнных насельнікаў назвалі таму, што яны своеасабліва вымаўляюць дзеясловы, якія заканчваюцца на «ся». «Ой, нагукалаСА, стамілаСА, ды павалілаСА».

Упершыню сакуноў «адкрыў» наш зямляк, прафесар Ісак Абрамавіч Сербаў, які вывучаў жыццё, матэрыяльную культуру, вуснае паэтычнае і музычнае мінулае беларусаў. Пра побыт тутэйшага люду ён распавёў у кнізе «Беларусы-сакуны. Кароткі этнаграфічны нарыс», якая выйшла ў Петраградзе ў 1915 годзе. Паводле слоў вучонага, сакуны — частка беларускага племені дрыгавічоў, што засялялі верхнюю плынь ракі Пціч і яе прытока Арэсы (Росі). А гэта з дзясятак вёсак у сучасных Старадарожскім і Асіповіцкім раёнах. Сяліліся сакуны звычайна на астраўку, уздоўж берага рэчкі альбо балота. Вуліцы ў паселішчы былі крывыя і вузкія, адзін канец пры ўездзе называўся «белым», супрацьлеглы — «чорным». Двары былі адгароджаны ззаду і ад дарогі праслам альбо частаколам. Сваю сядзібу будавалі сакуны таксама арыгінальна. Хата (памерам 6,5 на 5,5 метра) была без фундамента, першы вянец клалі адразу на зямлю ці на камяні, абгароджвалі вакол бярвеннем і абсыпалі зямлёю. Стаяла хата абавязкова на адлегласці 3-4 метры ад вуліцы і мела толькі тры маленькія акенцы. Адно з іх глядзела на вуліцу, два іншыя — на задні двор.

— Падворак камплектаваўся па-рознаму, — расказвае кіраўнік гісторыка-этнаграфічнага музея вёскі Залужжа Ніна Шчыткавец. — Пагонны двор — гэта калі ўсе пабудовы за хатай ідуць у адзін рад. Вянковы ўключаў некалькі гаспадарчых збудаванняў, размешчаных па крузе, вянком. Ёсць Г- і Т- падобныя забудовы. Насупраць хаты абавязкова «стопка» — памяшканне для захоўвання гародніны, у асноўным бульбы.

Ветурач адкрытага акцыянернага таварыства «Залужжа» Аляксандр Ждановіч прыехаў сюды 26 гадоў таму.

— У той час у вёсцы было шмат падобных сядзіб, крытых гонтам і нават саломай, — кажа ён. — Мне такое было ў навіну, бо сам родам з Капыльшчыны, дзе і дамы стаялі больш дыхтоўныя, і людзі жылі больш заможна. Дзівіла і тое, што тутэйшыя адмаўляліся праразаць чацвёртае акно. На маю думку, так бы яно было і відней, і святлей.

Колькі такіх сядзіб цяпер у Залужжы, падлічыць цяжка. У некаторых засталіся толькі нейкія элементы былой архітэктуры ці асобныя пабудовы. Па словах Ніны Лявонаўны, у першапачатковым выглядзе захавалася толькі адна.

Таццяна Чака, якой за восемдзесят, — сапраўдная прадстаўніца сакуноў.

— Майму старэйшаму, Кольку, быў год, як мы ўлезлі ў новую хату. А ён з 57-га, — падзялілася са мной гаспадыня.

— Чаму ў вас толькі адно акно на вуліцу дляздзіць?— цікаўлюся ў Таццяны Рыгораўны.

— А начорта яно, другое? Спаць будзеш класціса — дык суседзі мяккае месца ўбачаць, — смяецца бабуля. — Таму і ставілі ложкі з таго боку, дзе акна нямашака.

— І хата чаму без фундамента? — працягваю.

Мая суразмоўніца рэагуе імгненна:

— Далібог, недацёпа ты — грошай на фундамент не хапала!

Але хутчэй за ўсё гэта не толькі эканомія, але і традыцыя. Не ў звычках сакуноў было будаваць і лазні: мыліся яны звычайна ў начоўках. А яшчэ студні не мелі «жураўля», тут не карысталіся каромыслам, а вёдры з вадой насілі ў руках.

❑ ❑ ❑

Экспазіцыя мясцовага музея дае ўяўленне аб побыце, шматлікіх талентах тутэйшых. Побач з сельскагаспадарчымі прыладамі, начыннем сялянскай хаты пачатку XX стагоддзя — саматканкі. Для гэтай мясцовасці ўласціва была тэхніка ткацтва, пры якой узор выступае над паверхняй тканіны і хутчэй нагадвае вышыўку. Назва ткацтва — бранае — ідзе ад слова «браць», калі ніткі асновы нібы прабіраюцца пры дапамозе спецыяльнай дошчачкі — «бральніцы». Такім арнаментам аздаблялі ручнікі, абрусы, сурвэткі, жаночае адзенне. Упрыгожаныя прадметы мелі рытуальнае значэнне, былі звязаны з рознымі святамі і абрадамі, таму і ўзоры на іх з'яўляюцца сімваламі — абярэгамі.

— Якія яны, сучасныя сакуны? — цікаўлюся ў кіраўніка музея.

— Карэнных насельнікаў засталося нямшат. Нашы залужакі (так называюць сябе мясцовыя жыхары) кажуць пра сваіх, што яны зладзеі: маўляў, залужак сваю шапку зніме — ды на плот павесіць, а чужую ўкрадзе. Але гэта жарт — яны вельмі працавітыя, добрасумленныя, заўсёды трымаюць сваё абяцанне. Апошнім часам заўважаю тэндэнцыю, што маладыя сталі больш зласлівыя, мянушкі прыдумляюць па фізічных недахопах. А вось старэйшыя давалі прозвішчы, якія ёміста характарызавалі характар, звычкі, паводзіны чалавека. Добрых людзей называлі ласкава-памяншальна: Саўка, Сяргейка, Валодзька. Няздатнага да навукі, таго, хто дрэнна ведаў алфавіт, — Абадэм. Гамашом абзывалі таго, хто казаў «памаш» — скарочанае ад «панімаеш». Галяшом — беднага чалавека.

Ніна Лявонаўна разам з вучнямі абышлі старажылаў, сабралі з добрае рэшата падобных выразаў. Але паходжанне некаторых з іх, прынамсі, слова «зэндаль» так і не ўдалося высветліць. Сапраўды, цяжка чужынцу (напрыклад, мне) было здагадацца, што «ёмка» — гэта чапяла, «кот» — грыб падбярозавік, «блішчакі» — людзі, якія ходзяць глядзець вяселле, «яўмен» — тупы, «жуковіна» — пярсцёнак, «мешалка» — нязграбная жанчына.

Былы дырэктар мясцовай школы, а цяпер старшыня Дражнаўскага сельскага Савета Міхаіл Казлоў, згадвае, што раней маладыя настаўнікі, якіх размяркоўвалі ў школу, не маглі адвучыць сваіх падапечных ужываць у дзеясловах «цвёрдыя» канчаткі. Цяпер жа першакласнікі гавораць «правільна». «У нашым класе толькі прыезджыя з Палесся сакаюць, а яшчэ старыя бабулькі», — падзяліліся са мной школьніцы.

Прызнацца, пакідала я вёску з неадназначным пачуццём. З аднаго боку, прыемна, што ў наш скарацечны час яшчэ існуюць такія самабытныя астраўкі народнай культуры. Але дзе гарантыя, што праз колькі гадоў яны не знікнуць? Захаваць гэты запаведнік можна толькі пры падтрымцы — і дзяржавай, і прыватным бізнэсам, і грамадскасцю. Чаму б тут не стварыць музей пад адкрытым небам? Прычым не штучны, не выдуманы, а самы сапраўдны — пакуль у старэнькіх хатах сакуноў не з'явілася чацвёртае акно.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

НЕ ШВЕЙЦАРЫЯ, АЛЕ...

У Браслаўскім раёне збіраюцца адрадзіць элітны від спорту — правядзенне рэгат

ЦІКАВА, што калісьці ў гарадку, у якім зараз пражывае каля 9,8 тысячы чалавек, існавала некалькі яхт-клубаў. Цяпер такі клуб ствараецца. У райвыканкаме ўпэўнены, што правядзенне відовішчных водных спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню зробіць Браслаўскі край яшчэ больш прыцягальным для турыстаў і бізнэсменаў.

Пра неабходнасць больш актыўнага адраджэння водных відаў спорту і аднаўленне традыцыі правядзення рэгат заявіў нядаўна **старшыня Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта Сяргей ШМАТАЎ.** Адбылося гэта на традыцыйным свяце народнай творчасці «Браслаўскія зарніцы», якое тры гады таму атрымала статус міжнароднага.

Правядзенне рэгат вырашылі не адкладваць на далёкую перспектыву. Дарэчы, пры раённым фізкультурна-спартыўным клубе ёсць група па парусным спорце. Кожны год на Браслаўшчыну прыязджае нямала людзей, якія могуць сабе дазволіць раскошу адпачыць на яхтах. Гасцей вабіць азёрны край. Дарэчы, азёры займаюць каля 10 працэнтаў плошчы раёна. Найбольш буйныя — Дрывяты, Снуды, Струста — уваходзяць у так званую Браслаўскую групу азёраў. Апошняя — найбуйнейшая ў Беларусі: уключае 31 возера. Большасць азёр злучаны невялікімі рэкамі, ручаямі, канавамі і пратокамі.

Браслаўшчына здаўна заваявала славу аднаго з найпрыгажэйшых прыродных куткоў Беларусі. Асабліва прыгожыя мясціны на поўначы ад Браслава.

Багаты і разнастайны жывёльны свет Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры». Тут больш за 20 відаў рыб, у тым ліку такія каштоўныя, як вугор, судак, шчупак, мянтуз. Сустракаецца больш за 200 відаў птушак, з іх 45 відаў адносяцца да рэдкіх і знікаючых, 189 відаў гняздуюцца на тэрыторыі парку. З буйных жывёл у лясах — лось, мядзведзь, дзік, казуля, воўк, рысь. Батанікі налічылі на тэрыторыі парку каля 800 відаў флоры, і 20 з іх з'яўляюцца рэдкімі для Беларусі.

Нядаўна ў азёрным краі прайшоў рэспубліканскі злёт падводных паляўнічых. Турнір «падводнікаў» сабраў больш за 200 чалавек з Беларусі, Расіі, Латвіі, Украіны. Цікава, што самаму малому ўдзельніку злёту не было яшчэ і года, а самы «дарослы» ўжо даўно на пенсіі.

Фота БЕЛТА.

— Браслаўшчыну па праве называюць беларускай Швейцарыяй. Калі паглядзець на карту, то зямля Браслаўскіх азёраў разам з азёрамі Латвіі і Літвы стварае еўрапейскую геаграфічную мазаіку. Сапраўды, мала знойдзецца ў Беларусі месцаў, чыё гістарычнае мінулае і сучаснае жыццё былі б цесна «пераплецены» з азёрамі, — кажа старшыня Браслаўскага раённага выканаўчага камітэта Сяргей Шматаў. — Край Браслаўскіх азёраў — гэта месца, адкрытае для розных культур і людзей, але, разам з тым, ён захаваў нацыянальныя традыцыі свайго рэгіёна. Прывабнасць Браслаўшчыны — у рэльефе, прыродзе, чыстым паветры, а таксама магчымасці падарожжаў па прыгранічных раёнах трох дзяржаў. Актыўны турызм на працягу ўсяго года, грандыёзныя культурныя мерапрыемствы — усё гэта адбываецца на фоне найпрыгажэйшых пейзажаў. Бог сапраўды шчодра надзяліў наш край прыгожымі прыроднымі краявідамі.

Наяўнасць помнікаў архітэктуры і іншых гістарычных аб'ектаў толькі ўзмацняюць прывабнасць Браслаўшчыны для айчынных і замежных турыстаў, ствараюць дадатковыя магчымасці для развіцця гэтай сферы. Праграмай развіцця Браслаўскага раёна на 2011—2015 гады ў тым ліку прадугледжана на Замкавай гары ў Браславе аднавіць фрагменты старажытнага гарадзішча — элементы драўлянай крэпасці, асобных будынкаў. Запланавана і будаўніцтва культурна-забаўляльнага і гандлёвага цэнтраў у Браславе, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу на аўтадарозе міжнароднага значэння, санаторыя ў вёсцы Відзы-Лаўчынскія... Задумалі рэканструкцыю будынкаў, што пустуюць, пад сельскія сядзібы для арганізацыі аграрнага і экалагічнага турызму... Так што з цягам часу Браслаўшчына можа сапраўды ператварыцца ў Швейцарыю. Пры ўмове, што ўсё створанае і пабудаванае будзе падтрымлівацца ў належным стане.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Браслаўскі раён.

■ Славянскі базар-2012

АД ЛІТОЎЦАЎ — БЕСТСЕЛЕР І ПІВА

На Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», які распачнецца ў ліпені, літоўская дэлегацыя абяцае прадставіць фільм, што па паказах у Літве абышоў нават галівудскія стужкі, а таксама прывезці «Гарадок літоўскіх майстроў», у якім можна будзе пакаштаваць стравы літоўскай кухні, літоўскае піва, паўдзельнічаць у майстар-класах кавалёў, керамістаў і ткачоў.

— Літва бярэ ўдзел у Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», пачынаючы з 1993 года, і нязменна надае асаблівы каларыт літоўскай музыкі, песні, тэатральнага і кінамастацтва. Прадстаўнікі Літвы неаднаразова станавіліся лаўрэатамі Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». У прыватнасці, у 2008 годзе Гран-пры заваяваў малады літоўскі спявак Данатас Мантвідас (ён, дарэчы, паспяхова выступіў у апошнім фестывалі «Еўрабачанне». — **Аўт.**), — расказала віцебскім журналістам **кіраўнік дэлегацыі Літвы Юрга АНУСАЎСКЕНЕ**. — Для спявачкі Эвеліне фестываль стаў пачаткам шляху на вялікую сцэну. У 2006 годзе на конкурсе ў Віцебску яна атрымала Дыплом ФІДОФ і цяпер выступае ў Галівудзе. Эвеліна спецыяльна прылятае з Лос-Анджэлеса ў Віцебск, каб выступіць у двух канцэртах — начным «Песні лета» і ў Гала-канцэрце закрыцця фестывалю. Паспяхова выступаюць юныя літоўскія артысты на Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе, якому сёлета споўніцца 10 гадоў.

Што датычыцца кінастужкі «Гарачае сэрца», якая па паказах у Літве абышла нават галівудскія фільмы — яна заснавана на гістарычных падзеях. У сюжэце, зразумела, ёсць і лінія кахання...

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Пачытаем?

РАДКІ НАДРУКАВАНЫЯ, РАДКІ З НЕНАДРУКАВАНАГА

Уладзімір Караткевіч. Збор твораў. Том 1. Мінск, Мастацкая літаратура, 2012.

ТАК бывае: ідзе нейкая інфармацыя пра запланаваны выхад 25-томніка Уладзіміра Караткевіча, але яе можна прапусціць, не ўсвядоміць. Пакуль не возьмеш ужо гатовую кнігу — напрыклад, першы том выдання, які ўжо ўбачыў свет. І тады шкадуеш: як жа прапусціў падпіску?

Сапраўды, бываюць аўтары настолькі знакавыя і значныя для народа, што іх кнігі павінны быць у кожнай хаце. Караткевіч — такі аўтар. Аўтар, які стаў папулярным менавіта з-за таго, што ўмеў казаць пра важнае проста і ўмеў свае асабістыя перажыванні і думкі выказаці так, што кожны чытач разумеў: гэта і ў мяне так, гэта і мяне тычыцца. І бываюць перыяды развіцця народа, калі актуальнасць аўтараў вядзе да іх запатрабаванасці. Якраз на такі перыяд прыйшоўся выхад 8-томніка Уладзіміра Караткевіча, у якім былі змешчаны яго асноўныя творы.

Цяпер зноў Беларусь патрабуе Караткевіча. І зноў — каб зразумець, як развівалася краіна, народ, куды рухаюцца людзі і чаму, да яго трэба звяртацца. І да твораў, і да яго асобы. Вось якраз такую магчымасць — звярнуцца да асобы — дасць збор твораў у 25 тамах. Дзе творчасць Караткевіча будзе прадстаўлена больш поўна, дзе нават можна будзе адчуць яго асобу — праз дзённікавыя запісы ці ўрыўкі з запісных кніжак і каментарыяў да іх. Дзякуючы працы даследчыка Анатоля Вераб'я, які распрацаваў канцэпцыю выдання, кожны том будзе адметным.

Першы. Пачатак. Тое, што стане пачаткам знаёмства з Караткевічам для чытача, некалі стала пачаткам яго творчасці. Малады чалавек, які, апынуўшыся сярод носьбітаў іншай культуры, калі паступіў вучыцца ў Кіеўскі ўніверсітэт, стаў больш думаць пра сваю, напоўніўся адчуваннем еднасці з ёй. Вобразамі, якія нараджаліся разам з думкамі, ён напоўніў свае радкі. Так з'явіўся паэт. Які гэта быў паэт, якраз-такі паказвае першы том поўнага збору твораў. Ён паказвае, як аўтар вядомага «Машэкі» ўжо ў маладыя гады мог мысліць глыбока і не баяўся агучыць свае думкі. Вялікая частка твораў, змешчаных у томе, дагэтуль не друкавалася, таму ў чытачоў будзе магчымасць адкрыць для сябе і новае ў Караткевічу, у яго паэтычнай творчасці 50-60-х гадоў.

Том выйшаў і тыя, хто падпісаўся, могуць ужо пачаць дыялог з Караткевічам, чытаючы яго словы. А тыя, хто толькі зараз зразумеў, якія перавагі дае падпіска, будуць шукаць па кнігарнях: мабыць які-небудзь асобнік Караткевіча можна будзе злавіць і там?.. І цалкам магчыма, што якраз пасля выхаду першага тома ўвага да выдання ўзрасце. Сёлета павінен пабачыць свет яшчэ і другі том выдання. Нагадаем, што поўны збор у 25-ці тамах плануюць выдаць да 90-годдзя Уладзіміра Караткевіча, якое будзе адзначацца ў 2020 годзе.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

У СТАЛІЦЫ НЕ «РАЗМІНУЛІСЯ» ТРАМВАІ

На скрыжаванні вуліц Фрунзэ і Першамайскай адбылося сутыкненне трамвая маршрута №1 «Пл. Мяснікова» — «Зялёны Луг» (які ішоў у парк) і трамвая маршрута № 7 «Пл. Мяснікова — Пр. Ракасоўскага» (ішоў у кірунку праспекта). Транспартныя сродкі атрымалі нязначныя механічныя пашкоджанні. У выніку ДТЗ пацярпела пасажырка 1960 года нараджэння, якую з ударам носа даставілі ў бальніцу. Рух трамваяў маршрутаў №№ 1, 7 у адзін бок быў прыпынены на паўгадзіны. Разбор па факце здарэння праводзіць АДАІ Партызанскага раёна сталіцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

В опубликованном 26.04.2012 Бухгалтерском балансе ЗАСО «Дельта Страхование» за 2011 (Отчет о финансовых результатах) название «Отчет о финансовых результатах ЗАСО «Дельта Страхование» за 2011 г.» **следует читать** **«Отчет о прибылях и убытках за 2011 г.»,** в строке 150 отчета **следует читать «650953,7»,** в строке 190 отчета **следует читать «8357643,2».**

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0130428, 0130430, 0020973, 0130499 считать недействительными. УНП 101883943.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

МІЖНАРОДНЫ ГРОСМАЙСТАР Праграміст Мінскага маторнага завода Васіль Грабенка сур'ёзна захапляецца старадаўняй гульнёй. А пачынаў з яе азоў пад апекай бацькі Уладзіміра Іосіфавіча, які, дарэчы, паспяхова ўдзельнічаў у звяздоўскіх конкурсах рашэнняў шашачных пазіцый. Займаецца Васіль і самой гульнёй, і яе кампазіцыяй. Выступаў у завочных чэмпіянатах рэспублікі і быў нават прызёрам. Але верх бярэ ўсё ж кампазіцыя. Зараз па ёй ён уваходзіць у лік вядучых праблемістаў: неаднаразовы чэмпіён краіны, пераможца міжнародных спаборніцтваў, якія праводзіліся ў Літве, Беларусі, прызёр сусветнага чэмпіянату па стварэнні сталетачных эцюдаў. А нядаўна стаў лаўрэатам міжнароднага конкурсу «Пінск-2011», атрымаў 75 класіфікайцыйных балаў і з улікам паказчыкаў у іншых першынствах прадстаўлены для прысвоення яму звання міжнароднага гросмайстра.

Такім чынам, сярод беларусаў В. Грабенка першым стане самым тытулаваным складальнікам. Пазнаёмцеся з яго камбінацыйнай праблемай, ацэненай суддзямі ў 78,3 ачка. У ёй традыцыйна белыя пачынаюць і перамагаюць:

Белыя: b6, c5, c7, d2, d6, e3, e7, f2, f6 (9). **Чорныя:** a3, a5, b2, b4, d4, g3, g5, h4 (8).

СВОЙ КОНКУРС

Майстар Пётр Шклудаў (Наваполацк) працягвае яго чарговым заданнем — эцюдам 1980 года, у якім паправіў першы ход і пазбавіўся ад пабочнай развязкі:

№ 15/11. **Белыя**: d2, e3, дамкі g1, h4 (4). **Чорныя:** a3, b2, c7, h6, h8 (5). Выйгрыш.

❑ ❑ ❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

Аўтарскі -15 (П. Шклудаў): № 7. de7 (ab2A) b4, h8, a1x. A(f4) h8, a1 (g3) b6 (h2) g1x і № 8. h8 (d2) c3 (d2A) d4, f4, e1x. A(e1) d8, hf6, f6x.

Аўтарскі-16 (Л. Вітошкін): № 1. 21, 1 (9) 4 (42) 10, 47x; № 2. 4 (34) 21, 37 (32A) 38, 47x. A(17) 46 (22) 27, 41x і № 3. 39, 32, 1 (36AB) 23-18, 23x. A(14) 10 (37) 4 (41) 22x. B(10) 23-18, 36x. Поўная пабочная развязка: 33, 1x. Указалі І. Ананіч (Гродна), А. Белы (Наваполацк), У. Сапяжынскі (Рагачоў), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), В. Шульга (Мінск) і інш.

«Драматычны эпізод» (А. Пярхальскі-М. Лічко): 1... cd6? 2. hg5! 3. de3 f:d2 4. e:a5x.

Еўра-2012. Гульня, якую мы чакалі

ЧЭМПІЯНАТ Еўропы па футболе ўступіў у заключную стадыю. Цяпер лёс удзельнікаў вырашаецца ў адным матчы з моцным эмацыйным фонам і неабходнай канцэнтрацыяй зборных. Між іншым, ужо вядомы першы паўфіналіст. Партугальцы хоць з мінімальным лікам, але ўпэўнена перамаглі чэхаў — 1:0. Ну а пакуль іншым зборным-чвэрцьфіналістам яшчэ трэба цалкам сфарміраваць склад паўфінальных шчасліўчыкаў, эксперты «Звязды» разважаюць пра турнір, фіяска Расіі і каляфутбольную атмасферу сёлетняга першынства.

Той самы незалічаны гол украінцаў.

Сяргей БАЛАНОВІЧ, паўабаронца салігорскага «Шахцёра»:

— Рады, што на групавым этапе не было матчаў, якія завяршыліся з лікам 0:0. Гэта азітыўны момант. Каманды імкнуліся атакаваць, а не «сушыць» гульню, як гэта было на апошнім чэмпіянаце свету, дзе, мяркую, хапала пасрэдных матчаў. Усе зборныя на сваім узроўні. Персанальна за кімсьці на першынстве не сачу, але добрыя галы забіў Алан Дзагоеў. Акрамя яго, мне спадабаўся ўкраінец Яўген Канаплянка, але яму, як і шматлікім маладым гульцам, уласціва нервовасць. А вось расчараваны я вынікамі зборных Расіі і Украіны. Хацелася, каб яны прайшлі далей. Як стаўлюся да таго, што склад удзельнікаў наступнага Еўра пашыраць да 24 каманд? Канкрэтна не задумваўся, але для зборнай Беларусі гэта будзе дадатковы шанц, магчымасць, трапіць на чэмпіянат Еўропы.

Аляксей КУЛЬБАКОЎ, рэферы ФІФА:

— Як спаборніцтвы, чэмпіянат Еўропы мне падабаецца больш, чым, напрыклад, Алімпійскія гульні ці чэмпіянат свету. Тут сапраўды адчуваецца шчыльнасць у класе зборных. Усе каманды зараджаны на барацьбу. І агульны ўзровень першынства ад гэтага даволі высокі. Насцярожвае мяне каляфутбольная атмасфера. Навіны пра сутычкі, пра тое, што УЕФА штрафуе федэрацыі за паводзіны гэтых хуліганаў, не выклікаюць добрых пачуццяў. Справа ў тым, што футбалісты і суддзі знаходзяцца на стадыёне і не ведаюць, не могуць уздзейнічаць на тое, што адбываецца па-за межамі арэны. А сярод тых, хто парушае парадак, ёсць людзі, якім футбол не цікавы, яны атрымліваюць асалоду менавіта ад гэтых боек. У гэтым складніку сёлетні чэмпіянат мне не падабаецца. Дарэчы, сярод арбітраў на Еўра працуюць суддзі, з якімі імкнуся падтрымліваць кантакт. Найперш гэта тычыцца галандца Б'ёрна Кёйперса, які, праўда, ужо пакінуў чэмпіянат. А вось у яшчэ аднаго майго знаёмага — турка Джанэйта Чакыра — між іншым, ёсць неблагія шанцы атрымаць назначэнне на адзін з паўфіналаў.

Вадзім БРАЗОЎСКІ, выканаўца абавязкаў галоўнага трэнера ФК «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна):

— Шчыра прызнаюся, ад чэмпіянату Еўропы я не чакаў пэўных навінак. Так пакуль і адбываецца. Гляджу футбол, бачу, як каманды па тактыцы гуляюць у 3 абаронцы, у 5 паўабаронцаў. Цікава, а што яшчэ новае можна прыдумаць у футболе? Перажываў я за зборную Расіі, але, на жаль, яна расчаравала. Аб прычынах, калі не знаходзішся ў калектыве, казаць цяжка, аднак каманда да гэтага турніра ў іх падабралася сапраўды нядрэнная. Галоўным прэтэндэнтам на «золата» мне бачыцца зборная Іспаніі. З іншага боку хочацца разнастанасці, убачыць новага пераможцу. Лашчаць вока і запоўненыя балельшчыкамі стадыёны. У гэтым пытанні чэмпіянат яўна не падводзіць.

Артур ЖОЛЬ, журналіст газеты «Прессбол»:

— Еўра-2012 добрае тым, што 15 з 16 зборных-удзельніц напярэдадні апошніх матчаў групавой стадыі мелі шанцы трапіць у плэй-оф. Мне здаецца, гэтага ўжо не будзе праз чатыры гады, калі кантынентальны форум пашыраць да 24 месцаў дзеля «падтрымкі Плаціні ва Усходняй Еўропе». У Польшчу і ва Украіну трапілі сапраўды класныя зборныя. І Данія была далёка не аўтсайдарам групы смерці, дзе гуляла з Германіяй, Галандыяй і Партугаліяй, а яшчэ больш узмацніла напружанасць. Высветліць фаварытаў у чвэрцьфінальных парах таксама вельмі складана. Цудоўны чэмпіянат. І мне здаецца, што мы атрымліваем асалоду ад апошняга «сакавітага» Еўра!

Міхаіл АНДРУЖЭЙЧЫК, заслужаны трэнер Беларусі, дацэнт кафедры футбола і хакея Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры:

— На чэмпіянаце мне падабаецца ўсё. Акрамя пэўных рэферы, якія не залічылі гол Украіны ў вароты Англіі, не заўважалі парушэнні ў супрацьстаянні Польшчы і Расіі. Але гэта асобныя фрагменты. Ад усіх зборных у мяне добрыя ўражанні. Германія, Партугалія, Іспанія... Галандцы таксама добра гуляюць, але ў іх змена пакаленняў. Напэўна, занадта перахвалілі каманду. Стварылі вакол яе штучны ўзровень «усіхперамагальнай» зборнай. Харваташ я лічу лепшай па характары славянскай камандай на чэмпіянаце. А вось у правале Расіі не вінаватыя футбалісты, вінаваты трэнер. Дзік Адвакат найперш цудоўны клубны трэнер, яго «Зеніт» перамог усіх у Расіі. У фінале я хацеў бы ўбачыць Іспанію і Германію. Астатнія імкнуцца канкурыраваць на роўных, але, здаецца, ім саступаюць. Агульны ўзровень футбола ў Еўропе досыць высокі. І я не згодны, што ў чэмпіянаце з 24 зборнымі будуць прахадныя гульні.

Тарас ШЧЫРЫ.

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества «МИНСККОНТРАКТ»!

УНП 100251588

Настоящим сообщаем Вам, что внеочередным общим собранием акционеров ОАО «Минскконтракт», прошедшим 18 июня 2012 г. (протокол № 26) ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ РЕОРГАНИЗОВАТЬ ОАО «Минскконтракт» В ФОРМЕ присоединения К НЕМУ ОАО «Беллесбум».

Акционеры, не принимавшие участие в общем собрании акционеров ОАО «Минскконтракт» 18 июня 2012 г., имеют право в срок до 18 июля 2012 г. обратиться по адресу: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25, каб. 206, с письменным заявлением о требовании выкупа акций, эмитированных ОАО «Минскконтракт», в соответствии со ст. 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах». При обращении акционеру физическому лицу необходимо при себе иметь паспорт, иному лицу, представляющему интересы акционера, — документы, удостоверяющие его полномочия.

Заявление может быть направлено почтовой связью по адресу, указанному в настоящем объявлении, заказным письмом с уведомлением о вручении. Подпись акционера, иного лица, представляющего интересы акционера, на заявлении должна быть нотариально удостоверена.

Заявление должно содержать:
- фамилию, имя, отчество, адрес места жительства (регистрации) — для акционера физического лица;
- полное наименование, юридический адрес — для акционера юридического лица;
- количество простых (обыкновенных) акций (цифрами и прописью), требование о выкупе которых акционер заявляет;
- основание, по которому акционер требует выкуп акций.

Акции выкупаются ОАО «Минскконтракт» по номинальной стоимости (пятьдесят тысяч белорусских рублей за одну акцию), оплата осуществляется в кассе ОАО «Минскконтракт» по адресу: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25, каб. 202, в течение 30 дней после истечения срока предъявления акционером требования о выкупе акций.

ОАО «Гомельхлебопродукт»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Гомельхлебопродукт» 06 июля 2012 года

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О распределении прибыли Общества за 2011 год.
2. Об утверждении дивидендов за 2011 год и сроках их выплаты.
3. О внесении дополнений в устав Общества.

Собрание состоится по адресу: **г. Гомель, ул. Мазурова, 48.** Начало **в 14.00**.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: **г. Гомель, ул. Мазурова, 48.**

Регистрация участников собрания будет проводиться **с 13.00 до 13.45** в день и по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 400010980 *Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».*

«Частный институт управления и предпринимательства»
с 1 августа по 30 сентября 2012 г.
ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР В АСПИРАНТУРУ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТИ
08.00.05 – «Экономика и управление народным хозяйством».
Дополнительная информация: тел. 263 38 26, сайт: www.imb.by

Наш культурны асяродак
ЖЫВАНДОЛЯ
Выпуск № 21 (150)

■ Прэм'ера

СМЕРЦЬ ЧУЖАЯ, СМЕРЦЬ СВАЯ

ЧАМУ ЯЎГЕН АНЕГІН ПАМРЭ АД АДЗІНОТЫ?

Ён забіў!.. Забіў такога юнага, летуценнага хлопца. І з-за чаго? З-за глупства нейкага. Тое, што для яго спакуса, для другога — нечаканая здрада сябра і каханай. І вось вынік... І пасля гэтага змог жыць, прыехаў на тусоўку... Выбачайце, на баль прыехаў. Пра магчымасць кахання падумаў...

А было б з-за чаго страляцца!.. Не, ну дзіўныя яны былі нейкія ў XIX стагоддзі, пры Пушкіне. Ледзь што — за зброю, гонар абараняць. Мо таму, што ведалі, што такое гонар чалавечы. Было паняцце: дзе сумленна, а дзе — не. Дзе шчыра, а дзе — не. Дзе жыццё, а дзе — гульня ў жыццё.

Паглядзела прэм'еру «Яўгена Анегіна» Пятра Чайкоўскага, які раман у вершах ператварыў у оперу, і падумала: тып людзей, як Яўген Анегін, не такі ўжо і незразумелы нам, у XXI стагоддзі. Падаецца, што пры Пушкіне гэты тып людзей — якія жывуць дзеля сябе і не маюць адказнасці за жыццё іншых, з кім перакрыжоўваецца іх шлях, — толькі з'яўляўся. А цяпер ён правіць баль. Няхай і не ў такіх палацах жыве, і не апранаецца, як герой спектакля Нацыянальнага тэатра оперы і балета Беларусі. Але можа зламаць жыццё (хоць і не забівае літаральна), іграе на чужых пачуццях і баіцца шчырасці. Чым не сучасны герой-палюбоўнік?

І так... Яна звалася Таццяна. Прыгажуня, разумніца. Галоўнае — якая глыбокая і шчырая дзяўчына! Адмовіцца ад такой мог толькі...

Не, ну што з таго, што яна сама прызналася ў каханні? Пасля таго, як у школе прайшлі твор Пушкіна, гэты момант ні ў каго не выклікае здзіўлення. Ды і дзявочае прызнанне, калі яно шчырае, заслугоўвае павагі. Прынамсі, гэта прадэманстраваў сам Чайкоўскі. Аднойчы атрымаўшы ліст з прызнаннем ад маладой захопленай ім дзяўчыны, кампазітар вырашыў ажаніцца з ёй. Таму і опера ў яго напісалася вельмі лірычная.

У нашым тэатры яна атрымалася такой лірычнай, што музыка літаральна засмоктвае, заспакойвае, закалыхвае... А ў нейкія драматычныя ці нават экстрэмальныя моманты не думаеш зусім пра тое, што ж там адбываецца з героямі на сцэне, а толькі слухаеш, як артысты спяваюць. Адзначаеш для сябе і пазнаеш вельмі вядомыя музычныя эпізоды — нават ад уверцюры. І гатовы спяваць разам з героямі. Наўрад ці якая жанчына ці дзяўчына будзе спакойна слухаць ліст Таццяны (яе партыю ў розных складах спяваюць Настасся Масквіна і Алена Золава), які напісаны гукамі вельмі пранікнёна. Альбо хітовая арыя Ленскага (А. Мікуцель і Ю. Гарадзецкі) так засмокча ў лірыку, што і асэнсаваць не паспееш, як герой ужо падае з-за стрэлу. А калі Анегін (Ул. Пятроў і Ул. Громаў) апынуўся на пецярбургскім балі, то ён такі засяроджана-лірычны, што і баль гэты ідзе нібыта фонам, хоць і пары прыгожыя круцяцца ў вальсе. Што казаць ужо пра арыю Грэміна (А. Валенцій і В. Кавальчук), пра тое, што «каханню ўсе ўзросты пакорныя»? І словы гэтыя ведае кожны, і калі трэба будзе іх праспяваць, то напэўна ж, прыйдзе ў галаву мелодыя, недзе і некалі, можа і выпадкова, пачутая. Таму сядзі, слухай, пазнавай. І без нейкіх асаблівых інтэрпрэтацый можна, у прынцыпе, задаволіць слухача.

А нейкіх асаблівых інтэрпрэтацый тут і няма. Зрэшты, як і ўласна рэжысёрскай працы ў плане нейкага асаблівага бачання твора на сцэне. Рэжысёрам рэдакцыі быў Аляксандр Прахарэнка. Атрымалася класічная опера ў класічным выглядзе. Героі — з XIX стагоддзя. І антураж, у якім яны існуюць, — адпаведны. Сядзіба — значыць, сядзіба. Дзявочы пакойчык — значыць, пакойчык. Страляюцца — значыць, на прыродзе. Баль — значыць, танчаць у палацы. Нічога такога, што б адцягвала ўвагу, усё па тэме. Усё — згодна з тым часам. Мастацкае ўвасабленне зрабіў Дзмітрый Мохаў.

Класіка — бяспройгрышны варыянт, якому ўсе ўзросты падуладныя. Што выдумляць, калі ўсе чыталі «Яўгена Анегіна»? Папулярны твор Пушкіна. І опера Чайкоўскага папулярная. У беларускім оперным тэатры «Яўген Анегін» быў у афішы з 1933 года. Розныя дырыжоры звярталіся да оперы, імкнучыся прадставіць гэты твор у сваёй музычнай інтэрпрэтацыі. Гэтым разам на лірыку пацягнула народнага артыста Беларусі дырыжора Аляксандра Анісімава. За харавую частку адказвала народная артыстка Ніна Ламановіч.

Гэта, напэўна, не той спектакль, ад якога варта чакаць нейкіх тэхнічных «наваротаў». Нават дзіўна для нашага цяперашняга тэатра, які любіць уражваць суперсучаснасцю. Насамрэч проста опера такая. У ёй аснoўнае — самі героі і іх партыі. Гэта ацэняць тыя, у каго ёсць любімы артыст у оперным тэатры, які спявае ў спектаклі. Я, напрыклад, паслухаўшы Настассю Масквіну, задумалася: а ці не напісаць які-небудзь ліст з прызнаннем у каханні. Дзе ты, мой Анегін?

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Культурная сталіца

ОПЕРА ВЯРТАЕЦЦА Ў ЗАМАК РАДЗІВІЛАЎ

Яна там калісьці гучала: у Нясвіжскім тэатры Радзівілаў ладзіліся вялікія прэм'еры, нават для каралеўскіх асоб. Гэта стала гісторыяй.

Цяпер ёсць сучаснасць. І ёсць замак, які хоча жыць. Гэта значыць — не проста існаваць, а поўніцца падзеямі, прымаць людзей. Дзеля гэтага трэці год запар Нацыянальны тэатр оперы і балета Беларусі едзе ў Нясвіж са сваімі спектаклямі.

Фестываль опернага і балетнага мастацтва ў Нясвіжы пачаўся ўчора з апошняй прэм'еры тэатра — оперы «Яўген Анегін». Не паспела ўся оперная публіка сталіцы Беларусі перабываць на прэм'еры, а паслухаць оперу можна было ў культурнай сталіцы. Тут адбылося трэцяе выкананне твора Чайкоўскага, дырыжыраваць якім выпала Вячаславу Волічу. Дзеля гэтага ўнутраны дворык палаца быў ператвораны ў тэатральную залу на паветры, дзе было месца і для сцэны, і для гледачоў.

У суботу, 23 чэрвеня, у палацы Радзівілаў вечар балета: «Кармэн-сюіта» Радзівона Шчадрына (паводле Ж. Бізэ) і «Балеро» Марыса Равэля. Дырыжыраваць будзе Мікалай Калядка.

Гала-канцэрт, які адбудзецца ў нядзелю, прыцягвае ўвагу не толькі тым, што будзе выконвацца, а яшчэ і тым, што дае выдатную магчымасць паслухаць лепшых салістаў Нацыянальнай оперы, паглядзець на цудоўных артыстаў беларускага балета, адначасова ацаніць узровень хору і аркестра. Таму што будуць выконвацца папулярныя арыі з класічных опер і фрагменты балетаў. Гэта канцэрт, у якім будзе ўсё! Дырыжор — заслужаны артыст Украіны Віктар Пласкіна.

Але імпрэзамі толькі ва ўнутраным дворыку палаца фэст не абмяжуецца. Таму што ў гэтыя дні папулярная класічная музыка гучыць у гарадской ратушы Нясвіжа. Беларуская музыка, якая з'яўляецца нашай класікай і вяртаецца да нас з забыцця, гучыць у асобнай праграме «Музычнае прынашэнне» ў касцёле Божага Цела. Але і тэатральная зала ў самім палацы ажывае — праз канцэрт твораў на словы Уладзіслава Сыракомлі, лёс якога звязаны з Нясвіжам.

Ларыса ЦІМОШЫК

СПЫНІЦЬ ФАЎСТА

СЁННЯ Ў НЯСВІЖЫ ПАКАЖУЦЬ ФІЛЬМ З УДЗЕЛАМ АНТОНІЯ РАДЗІВІЛА, ФАЎСТА І ГЁТЭ

На здымках фільма «Фаўст Радзівіла», рэж. Антаніна Мірашнічэнка (Белвідэацэнтр, 2012).

БЕЛАРУСКІ відэацэнтр зрабіў фільм пра оперу «Фаўст», напісаную Антоніем Генрыкам Радзівілам. Лібрэта для гэтай оперы напісаў сам Гётэ па просьбе нашага славутага земляка. Але прэм'ера адбылася пасля смерці абодвух творцаў — у 1835 годзе. На доўгі час пра оперу Радзівіла забыліся. Да сюжэта Гётэ кампазітары звярталіся 80 разоў. Усе выдатна ведаюць пра «Фаўста» Берліёза, Шумана, Байто. Але пра тое, што Антоній Радзівіл асабіста сустракаўся з Гётэ, а потым напісаў оперу паводле славутага твора нямецкага генія, ведаюць адзінкі. Выкладчык і папулярызатар беларускай музыкі Віктар Скарабагатаў загарэўся ідэяй вярнуць оперу «Фаўст» Радзівіла. І так расстараўся, што ажно здзейсніў пастаноўку оперы і нават сыграў там Мефістофеля. Уласна, пра гэта і распавядае стужка рэжысёра Антаніны Мірашнічэнкі.

26 хвілін вяртання ў мінулае: гісторыя напісання оперы, гісторыя жыцця дзеда Антонія Генрыка Радзівіла, які слыў тым яшчэ самадурам, прыняў ійдаізм, меў гарэм і займаўся алхіміяй. Мяркуюць, што менавіта пра дзеда Марціна ўзгадваў Антоній Радзівіл, калі ствараў сваю оперу. Не ўпэўненая, што аўтару стужкі «Фаўст Радзівіла» ўдалося спыніць імгненне, але ў чарговы раз спыніць скептыцызм адносна значнасці Радзівілаў для беларускай культуры ўдалося дакладна. Усё-ткі рэжысёр, хоць месцамі і не зусім удала, засведчыла для гісторыі: Гётэ нікому з кампазітараў не даверыў свой твор, акрамя беларуса Антонія Радзівіла. Напэўна, гэта хоць нешта ды значыць.

Стылістычна фільм даволі традыцыйны для дакументальнага жанру. У кадры мы пераважна бачым розных знаўцаў і экспертаў, якія дзеляцца сваімі ведамі і ўражаннямі пра Радзівілаў, «Фаўста» Гётэ і оперу, якая іх аб'ядноўвае. Асобную ўвагу можна было надаць містычным выпадкам, якія адбываліся ў Оперным тэатры. Але ўсё самае цікавае (падчас рэпетыцыі оперы на сцэне пайшоў дождж, а падчас уручэння дыплома Віктару Скарабагатаву (Мефістофель) шкло на дыпломе трэснула без дай прычыны) рэжысёр неабачліва запхнула ў другую частку карціны — ні экшэну, ні фэнтэзі, ні духу Радзівілаў не атрымалася. А шкада, бо тэма вельмі плённая.

Радуе, праўда, што Белвідэацэнтр абірае ўсё-ткі чыста беларускія ўнікальныя тэмы для сваіх стужак. А значыць, будзе расці і цікаўнасць да беларускай культуры. Асабліва, калі прагляд кіно будзе адбывацца ў такіх заахвочвальных для гэтага месцах. Як, напрыклад, Нясвіж. А ўзровень беларускай кінадакументалістыкі падцягнецца адпаведна.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ВІЗІТ САШЫ

ЧАМУ КІНЕМАТАГРАФІЧНЫЯ СТАСУНКІ БЕЛАРУСІ З ІЗРАІЛЕМ МОГУЦЬ БЫЦЬ КАРЫСНЫМІ

Ізраільскі рэжысёр Саша Кляйн сустрэўся з беларускімі кінематаграфістамі і прачытаў захапляльную лекцыю студэнтам Акадэміі мастацтваў пра ізраільскі кінематограф, выгады глабалізацыі і капіталізму і патлумачыў, як наталіць сцэнарны голад.

Саша Кляйн, выхадзец з Украіны, які рэпатрыіраваўся ў Ізраіль у 1974 годзе, не ўпершыню наведвае Мінск. У 1997-м ён здымаў тут стужку пра халакост... Сёлета прыехаў з не менш высакароднай місіяй. Перамовы аб сумеснай кінавытворчасці паміж Ізраілем і Беларуссю ідуць ужо колькі гадоў. Магчыма, візіт Сашы Кляйна паскорыць працэс. Дарэчы, дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Алег Сільвановіч расказаў, што ў Канах, падчас працы нацыянальных павільёнаў, таксама ішла гаворка пра сумесныя кінапраекты нашай краіны з Ізраілем. Вядома, ніхто пакуль не раскрые карты і не скажа, што ж гэта за яны. Бо кінавытворчасць — штука зменлівая: праца над адной стужкай можа ісці гадамі і невядома чым скончыцца. Але папярэдняя інфармацыя сведчыць, што размова вядзецца пра некалькі дакументальных стужак і нават дзве поўнаметражныя ігравыя карціны.

— Дамова паміж нашымі краінамі аб супрадукцыі — гэта вельмі важны і неабходны крок, — лічыць рэжысёр Саша Кляйн. — Таму што кіно — дарагая вытворчасць, і невялікім краінам складана спраўляцца з ёй сваімі сіламі. Аб'яднанне намаганняў можа прывесці да таго, што мы будзем рабіць сумесныя фільмы на тэмы, якія будуць хваляваць і беларусаў, і ізраільцян, і іншыя народы. Для таго, каб пашырыць межы нацыянальнага мастацтва. Магчыма, у гэтым сэнсе глабалізацыя — гэта дабро для нашай прафесіі. Кінематаграфісты, зрэшты, як і іншыя творцы, знаходзяцца на фарпосце адносін паміж людзьмі. Сёння мы пачынаем размаўляць на мове культуры, заўтра пачынаецца дыпламатыя, паслязаўтра пачынаецца гандаль і стасункі паміж дзяржавамі выглядаюць значна больш прывабнымі.

Беларусы пра ізраільскае кіно, напэўна, таксама нешта памятаюць. Вядома, што сёння адбываецца своеасаблівы «бум» нацыянальных кінематаграфій невялікіх усходніх краін. Напрыклад, некалькі гадоў таму на ММКФ «Лістапад» паказвалі ізраільскую стужку «Візіт аркестра» аб прыгодах егіпецкага аркестра, які прыехаў на гастролі ў ізраільскі гарадок. Ды не ў той. Фільм здымаўся цалкам на англійскай мове і каштаваў менш за мільён долараў. Але яго касавы поспех лічыцца адным з самых удалых сярод усіх ізраільскіх фільмаў.

Кінематаграфічныя кантакты нашай краіны з Ізраілем могуць быць вельмі карыснымі як раз з-за гэтага «буму». Наладжаныя сувязі з Галівудам, буйнымі кінакампаніямі свету і сусветна вядомымі рэжысёрамі могуць інтэгравацца ў беларускую кінапрастору і істотна змяніць яе ў лепшы бок. Сам Саша Кляйн, дарэчы, працаваў з такімі творцамі, як Элем Клімаў, Юрый Кара, Георгій Данэлія і Павел Лунгін. Апошні свой фільм «Дырыжор» Лунгін якраз часткова здымаў у Ізраілі і нават задзейнічаў там групу ізраільскіх рускамоўных акцёраў (Ізраіль багаты на розныя тыпажы і магчымасць выбару акцёраў, якія валодаюць рознымі мовамі).

Адно шкада, што Беларусь чамусьці заўжды вельмі доўга вядзе ўсялякія перамовы... Вось і планы аб сумеснай кінавытворчасці з не менш прагрэсіўным у кінематаграфічным сэнсе Іранам агучваюцца ўжо не так смела і часта.

Ізраіль параўнальна невялікая краіна, але аб'ём кінавытворчасці там такі, што Беларусь можа толькі пазайздросціць. Напрыклад, у 2011 годзе там зняліся 24 мастацкія карціны, штогод здымаюць каля 100 дакументальных. Такі поспех — вынік мэтанакіраванай палітыкі ў галіне кіно. У 2001 годзе ў Ізраілі прыняты Закон аб кіно, згодна з якім штогод вылучаецца каля 21-22 мільёнаў долараў на падтрымку гэтага віду мастацтва. Асаблівая ўвага надаецца сцэнарыям, бо сцэнарны голад — сёння самая вялікая праблема ўсіх кінематаграфій свету. Прычым кіно ў Ізраілі цалкам субсідаванае, там практычна няма прыватных укладаў.

Кінематаграфіст — вельмі модная прафесія. Уся рэч у тым, што ў Ізраілі кіно — адзін з факультатыўных прадметаў атэстата сталасці падчас школьных іспытаў. Там 13 кінашкол, якія выпускаюць 250-300 тысяч спецыялістаў за год. Усё гэта стварае ўмовы для перадачы навыкаў ад сталых творцаў маладым, для прыходу новай генерацыі з новым прагрэсіўным бачаннем свету і мастацтва. Толькі так сёння яно можа выжыць у бязлітасным свеце, дзе галоўныя канкурэнты — менеджары, мерчандайзеры, дэматыватары, ю-туб і іншыя складаныя словы (і не менш бессэнсоўныя з'явы, якія стаяць за імі) з цяжкім вымаўленнем і лёгкім доступам, але якія, пры правільным падыходзе, можна паспяхова скарыстоўваць.

Да таго ж, там некалькі дзясяткаў разнастайных кінафестываляў, якія дапамагаюць мясцовым кінематаграфістам быць у кантэксце сусветных кінатэндэнцый і хутка ўкараняць новыя павевы ў сябе на радзіме. Бо на фестывалі, як правіла, прыязджае шмат цікавых людзей.

— Адкуль бяруцца тэмы? — задае рытарычнае пытанне Саша Кляйн, выдатны чалавек, дасведчаны спецыяліст, вялікі талент. — Тэмы вельмі рэдка з'яўляюцца проста так у галаве, калі ты сядзіш дома. Тэмы з'яўляюцца, калі ты глядзіш на жыццё і творчасць іншых людзей, ты разумееш, што сёння хвалюе свет і ўсведамляеш, як зрабіць такое кіно, у якім раскрываецца праблема, якая хвалюе выключна цябе, але можа зацікавіць усё чалавецтва.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

■ Асобы

«БРЫЛЬЯНТАВАЯ НАГА» І БЛЯСК БЕЛАРУСКАГА СУЧАСНАГА ТАНЦА

За вечарам сучасных балетаў танцоўшчык Канстанцін Кузняцоў назіраў збоку. І каб не гіпс!.. Усе пабачылі б, што цудоўных, каштоўных ног у беларускім балеце насамрэч больш, чым тыя, што былі на сцэне. І каштоўнасць гэтая — рэальная, пастаянная і са зняццем гіпсу яшчэ больш заззяе. Насамрэч ужо тое, што гэты вечар адбыўся і праз яго адбылося адкрыццё малой сцэны ў Нацыянальным тэатры оперы і балета Беларусі — ужо вялікая перамога апантаных сучасным танцам артыстаў, адным з галоўных натхняльнікаў якіх быў заслужаны артыст Беларусі Канстанцін Кузняцоў.

Насамрэч гэта прарыў!.. Гэта здаецца неверагодным і нават дзіўным: у царстве вытанчанай класікі з'явілася месца для іншых танцаў, якія не проста радуюць вока, але праз рухі разважаюць пра тое, што адбываецца з чалавекам у сучасным свеце. У Нацыянальным тэатры оперы і балета Беларусі 21 чэрвеня адкрылася малая сцэна.

Малая сцэна адкрываецца якраз для дзёрзкіх эксперыментаў, якія па-новаму раскрываюць магчымасці чалавечага цела, нясуць іншую эстэтыку. Эстэтыку новага часу. І гэта якраз тое, у чым хочацца паспрабаваць сябе маладым танцоўшчыкам. Калі яшчэ, як не ў маладосці, хочацца адчуць сябе сапраўдным уладаром уласнага цела, якому падуладныя розныя тэхнікі, калі яшчэ хочацца ў танцы адпусціць на волю душу і праз рухі імкнуцца спасцігаць яе жаданні, яе думкі, яе боль і яе ператварэнне? Вы думаеце, што гэта вельмі далёка ад нас? Вы думаеце, што там форма дамінуе над сэнсам? Вы думаеце: які сэнс у танцы? Тады вам — глядзець тое, што паказваюць маладыя беларускія танцоўшчыкі — тыя, хто спрабуюць сябе менавіта ў сучаснай харэаграфіі, таму што лічаць сябе людзьмі XXI стагоддзя. А якую музыку яны выбіраюць для сваіх пастановак! Ніно Катамадзэ, напрыклад, прыйшлася даспадобы Філіпу Мазураву, і ён стварыў нумар «Зноў і зноў». Дзмітрый Куракулаў, які працуе з гродзенскай трупай сучаснай харэаграфіі «Тад», паставіў «Вечны крокі рай» на музыку Джорджа Тэлбата. А вось Вольгу Костэль, якая пасля Мінскай харэаграфічнай гімназіі-каледжа павучылася ў Вышэйшай школе драматычных мастацтваў у Берліне, прывабліваюць кампазітары-класікі: Бах і Моцарт. Праўда, у іх музыцы яна знаходзіць асаблівую філасофію.

Таксама як і Раду Паклітару, выхаванец беларускай школы харэаграфіі, ужо вядомы ў свеце менавіта праз свой асаблівы погляд на танец . Ён зараз даволі плённа працуе ва Украіне, як і яго тэатр «Кіеў мадэрн-балет». Але стварае нумары для салістаў беларускага балета. У прыватнасці, яго харэаграфію любяць заслужаныя артысты Беларусі Юлія Дзятко і Канстанцін Кузняцоў. Але яны і самі захапіліся пастаноўкай уласных сучасных нумароў. А калі справа ёсць, то павінна быць і месца, дзе паказваюць яе вынікі.

Таму прарывам у бок сучаснай харэаграфіі падаецца сам факт адкрыцця сцэны, дзе яе можна будзе пабачыць. Але тыя, хто сам рыхтаваў гэтую падзею, глядзяць на яе трошкі інакш. Можа, з-за сціпласці?

Канстанцін Кузняцоў лічыць:

— Гэта толькі першыя крокі насамрэч...

— Наколькі яны абудзілі жыццё ў тэатры? Ці адчуваеце вы зацікаўленасць трупы ў працы менавіта з сучаснай харэаграфіяй?

— Гэта і робіцца для таго, каб маладыя танцоўшчыкі маглі паспрабаваць сябе ў чымсьці новым. Тым больш што назапасіўся даволі вялікі рэпертуар... Нам сапраўды ёсць што паказаць. Рыхтаваліся сучасныя нумары для конкурсаў, для канцэртаў, яшчэ для чагосьці, але не паказваліся ў Мінску з розных прычын. Хоць бы з-за таго, што не было пляцоўкі, гатовай прымаць такія праграмы. Таму гэта цікава. Бо калі танцаваць такія рэчы, як не ў маладым узросце? Маладым усё гэта даецца лягчэй, чым масцітым артыстам, таму што маладым не трэба сябе ламаць, яны гатовыя для эксперыментаў.

— Наша трупа выхаваная на класічным танцы. А тут іншая харэаграфія, іншы падыход. Ці ёсць складанасці і як вы іх пераадольваеце?

— Складанасці ёсць. У нас сапраўды цалкам адсутнічае школа сучаснага танца. А як вучыцца, калі не спрабаваць? Каб спрабаваць, трэба рухацца. Гэта нармальны працэс.

— Вы ж самі на класічным балеце выхаваны, але калі і як атрымалася, што вы захапіліся сучаснай харэаграфіяй?

— Нам з жонкай было заўсёды цікава спрабаваць нешта новае. Нам пашчасціла: мы былі знаёмыя з рознымі харэографамі. Наш сябра Раду Паклітару ставіў для нас. І шмат хто з іншых харэографаў, з якімі мы супрацоўнічалі. Мы нешта пераймалі: гэта ж не аднамомантавы працэс. Мне лёгка цяпер гаварыць — у мяне за спінай 20 гадоў стажу. Гэта адбывалася не адразу і не адзін год. І можа быць, гэта адбылося б нашмат лягчэй і хутчэй, каб яно было ўведзена ў праграму яшчэ на момант нашага навучання. Але, на жаль, гэты прадмет адсутнічае. Не, сам прадмет ёсць. Але навучання сучаснай харэаграфіі ў сучасным разуменні школы сучаснага танца — няма. Гэтаму ў нас пакуль не вучаць.



Падчас рэпетыцыі.

— А дзе вы свае нумары ўжо паказвалі да Беларусі? Можа, былі адзначаны?

— Адзначаны пакуль не былі. Мы не рвёмся ніколі за медалямі. Мы ставілі нумары для нашых маладых артыстаў, якім былі патрэбны мініяцюры для конкурсу. А калі казаць шчыра, то да нас прыходзілі маладыя людзі, якія не маглі заплаціць прафесійнаму харэографу з прычыны банальнай адсутнасці грошай, таму што гэта ўсё для моладзі каштуе надта дорага. Мы для іх рабілі бясплатна, таму што нам самім было цікава паспрабаваць, папрактыкавацца ў сучаснай харэаграфіі. Таму нумары ў своеасаблівай стылістыцы, таму што на адным конкурсе патрабуюцца нумары ў стылі джаз, на другім — неапластыка ці нешта яшчэ. Таму нумары рознапланавыя.

— Лічыцца, што беларуская публіка не зусім разумее гэтую стылістыку танца. На каго разлічваеце, і ўсё-такі самі ці збіраецеся публіку выхоўваць?

— Тут шлях адзін: рабіць такія праграмы, прадстаўляць і запрашаць людзей на іх. Таму што па асабістым вопыце ведаю: калісьці ў музычным тэатры была праграма «Вечары сучаснага балета». Мы танцавалі, калі там працавалі. Ставіўся сучасны рэпертуар, розныя харэографы над ім працавалі. І гэтая праграма карысталася цікавасцю. Таму што гэта заўсёды нешта новае. Аншлагі былі. Гэта запатрабавана. А публіку вучыць любіць нешта дзіўнае можна толькі адным шляхам: паказваць гэта якасна і пастаянна. Людзі пацягнуцца. Заўсёды знойдзецца глядач, які захоча паглядзець нешта, акрамя «Лебядзінага возера». Так, нехта можа любіць класіку, а нехта можа чакаць іншага танца.

— Як гэтая праграма збіралася? Таму што нумары не толькі розныя па стылістыцы, яны яшчэ і розных аўтараў. Што было вырашальным пры падрыхтоўцы праграмы адкрыцця новай сцэны?

— Па-першае, якасная складанка як харэаграфіі, так і выканаўцаў. Перш за ўсё — выканаўцаў. Таму што нават не вельмі цікавы нумар прафесійны танцоўшчык можа выканаць выдатна і зрабіць з яго цукерачку. І імкнуліся паказаць максімальна рознабаковую стылістыку. Не закрывацца ў адным кірунку. Таму што рэпертуар даволі вялікі атрымаўся ў выніку.

Але я прыняць удзел у канцэрце не змог: напярэдадні зламаў нагу. Таму літаральна ў апошнія дні ў праграме адбыліся істотныя змены. Дабавілі нумары студэнтаў харэаграфічнага каледжа.

— Што вы там такога небяспечнага ставілі?..

— Не паверыце, але гэта адбылося не на рэпетыцыі. Я ішоў па вуліцы і зламаў нагу. Насамрэч, як сказалі ўрачы, нага была на падыходзе да траўмы, я б яе ўсё роўна зламаў, таму што косць была перагружана. Напярэдзе чатыры тыдні ў гіпсе. Але калі я ўсё-такі папраўлюся і выйду на сцэну, то, можа, будуць людзі, якія захочуць прыйсці знарок паглядзець: што ж ён танцуе?..

Ларыса ЦІМОШЫК

ЖЫВАПІС ЖЫВЕ, ХОЦЬ ДЖЭКСАН ПОЛАК УСЁ СКАЗАЎ

ПАВОЛЬНЫЯ ЭСТОНЦЫ, ГАРАЧЫЯ ВЕНЕСУЭЛЬЦЫ І ТАЛЕРАНТНЫЯ БЕЛАРУСЫ ПАКАЗАЛІ, ХТО НА ШТО ЗДОЛЬНЫ СЁННЯ Ў ЖЫВАПІСЕ

У галерэях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць III Мінская міжнародная біенале сучаснага жывапісу COLORFEST. На выставе — палотны мастакоў з Беларусі, Украіны, Эстоніі, Малдовы, Латвіі, Літвы, Палесціны і Венесуэлы, якая сёлета з'яўляецца ганаровым госцем біенале. І заўважце, гэта не выстава сучаснага мастацтва, якіх вельмі шмат праводзіцца цяпер і на якіх можна пабачыць усё, пачынаючы з інсталяцый з туалетнай паперы і заканчваючы скульптурамі з шакаладу і чарнасліву.

COLORFEST — выстава менавіта сучаснага жывапісу. Здавалася б, цяпер, у век камп'ютарных тэхналогій, ніхто не піша карціны алеем, гуашшу, тэмперай або пастэллю. Не, яшчэ пішуць. Дакладней так: пішуць, і яшчэ як! Толькі з-за гэтага ўзнікае вельмі шмат розных пытанняў... Сучаснае мастацтва немінуча заблытваецца ў фармалізме і безыдэйнасці. Або ў звышідэйнасці і перайманьніцтве. Вось вам венесуэльскія карціны а-ля Фрыда Кало або Хуан Міро. Вось кубізм, фавізм, абстракцыянізм, мінімалізм... Але гэта ўжо нават не прагрэсіўна, бо мастакі не могуць прапанаваць абсалютна нічога новага ў гэтых стылях. Такое адчуванне, што каб яны напісалі нешта ў стылі галандскіх жывапісцаў часоў Адраджэння ў тэхніцы лесіроўка, то гэта выклікала б значна больш павагі і цікавасці хаця б з пункту гледжання маштабу зробленай працы. А так... Амерыканцы Джэксан Полак і Эндзі Уорхал, здаецца, сказалі на гэты конт усё яшчэ ў 1950-1960-х гг.

Тоні Тонг «Мастацтва і нафта» (Венесуэла).

Па адной экспазіцыі складна гаварыць пра нейкія тэндэнцыі або кірункі ў сучасным жывапісе. Бо любая выстава — гэта непазбежна тусоўка. Самі ведаеце, як у тусоўкі трапляюць. А таму нельга сказаць, што, напрыклад, сучасны ўкраінскі жывапіс вось такі. Не дай Бог! Ды я і не паверу ніколі, што гэтыя аморфныя безлімітныя карціны ў пясочна-стэпавым стылі, прадстаўленыя на біенале, — усё, што могуць прапанаваць сучасныя ўкраінскія мастакі. Талерантны беларускі абстракцыянізм (Уладзімір Клімушка, Алесь Квяткоўскі, Зоя Луцэвіч, Кацярына Сумарава і... як сюды патрапіў Віктар Некрашэвіч, божухна!) на фоне гэтага ўкраінскага нацюрмортна-пейзажна-кампазіцыйнага шэпту выглядае проста рэвалюцыяй нейкай.

Затое прыбалты крыху парадавалі. І хоць літоўскія, латышскія і эстонскія мастакі таксама грашаць на другаснасць аўтарскага стылю, але іх агрэсія захапляе. Яны не баяцца паставіць гледача ў няёмкае становішча, прымусіць яго пачырванець за тое, што ён пабачыў. Вось вам грымзолі ў стылі «на палях школьнага сшытка» ад літоўца Артураса Станчыкаса, а вось грымзолі ў стылі «я распісваю гэты чорны маркер» ад Асвальдаса Юшкі.

